ЯК АДЗНАЧЫЦЬ 80-ГОДДЗЕ МУЗЕЙ Я. КУПАЛЫ 12

НЕВЯДОМАЯ СТАРОНКА ПОДЗВІГУ ЭКІПАЖА ЛІ-2 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 САКАВІКА 2024 г. АЎТОРАК № 60 (30194)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«Беларускія прадпрыемствы ўпэўнена вядуць бізнес на рынку Еўразійскага эканамічнага саюза. У нас няма бар'ераў. Калі ёсць парушэнні, то аператыўна з імі разбіраемся. Той узровень экспарту, які мае сёння наша краіна, лішні раз даказвае, што мы здольныя і ўмеем працаваць на экспартным напрамку».

КОСМАС – НАШ!

23 сакавіка 2024 года, 15 гадзін 36 хвілін. Гэты час ужо запісаны ў гісторыі незалежнай Беларусі. З удалым стартам касмічнага карабля «Саюз МС-25» з Марынай Васілеўскай на борце мы сталі сапраўды касмічнай краінай. Без ніякіх там «але». Беларусы ўжо былі на арбіце Зямлі. Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак ляталі ў космас са сцягам СССР на скафандры, Алег Навіцкі, камандзір цяперашняй зорнай экспедыцыі, прадстаўляе Расію. А на скафандры Марыны Васілеўскай — наш, беларускі, сцяг. Ёй — велізарная адказнасць. Нам — нагода для гонару, хвалявання, радасці.

У тым, што палёт у космас і сёння застаецца не забаўляльнай прагулкай, а справай рызыкоўнай, якая патрабуе мужнасці і вытрымкі, гэтым разам пераканаліся ўсе. Спакойнымі заставаліся, здаецца, толькі галоўныя дзейныя асобы. У Марыны Васілеўскай, як расказалі пасля спецыялісты, нават у чацвер пасля адмены старту пульс быў 66! А ў суботу яны зноў, усмешлівыя і ўпэўненыя, ішлі да стартавай пляцоўкі, махалі рукамі на развітанне. За стартам, які трансліраваўся ў прамым эфіры, назіралі тысячы людзей. Першыя секунды, самыя напружаныя, мінулі, і ўпэўнены спакойны голас камандзіра карабля паўтарыў некалькі разоў, каб пачулі ўсе: «Палёт нармальны. Палёт нармальны...» Не паверыць яму, як і ў тое, што ўсё сапраўды будзе нармальна, было проста немагчыма.

Яны двое сутак ляталі вакол планеты па калязямной арбіце. Таксама выпрабаванне і подзвіг, асабліва для нашай Марыны, для якой усё ўпершыню. А ўчора ўвечары нарэшце адбылася стыкоўка карабля з Міжнароднай касмічнай станцыяй. І там ужо пачнецца звычайнае касмічнае жыццё і работа. Хаця слова «звычайнае» тут, здаецца, не зусім дарэчы.

Асабліва для нас — тых, хто застаўся на Зямлі і будзе хвалявацца, назіраць і чакаць іх вяртання.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

СТАР. 4

КАРАТКА

- Сярэдняя зарплата ў Беларусі ў лютым склала Br2025,7.
- **У Мінскай вобласці ўжо пасеяна больш за 10 % яравых і больш за 15 % траў.**
- БУТБ прадставіла магчымасць біржавога гандлю на эканамічных форумах у Варонежы.



- **Абмен вопытам і прыцягненне беларускіх спецыялістаў: што абмеркавалі кіраўнікі Мінэнерга Беларусі і МЗС Венгрыі.**
- У Беларусі выкарыстоўваецца больш за 22 % ад разведаных эксплуатацыйных запасаў падземных вод.

Актуальна

НАША ЛІЧБАВАЯ БУДУЧЫНЯ

Якія паслугі ўжо можна атрымаць з дапамогай некалькіх клікаў?

Адміністрацыйныя працэдуры суправаджаюць кожны этап нашага жыцця. Зарэгістраваць аўтамабіль або зняць яго з уліку, звярнуцца па дапамогу па цяжарнасці і родах, атрымаць сямейны капітал, пацвердзіць свае правы на нерухомасць — усё гэта яны. Праца спецыялістаў Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП) дазваляе шэраг адміністрацыйных працэдур атрымаць у некалькі клікаў, то-бок сэканоміць галоўны рэсурс кожнага з нас — час.

СТАР. 5

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2024 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 240060

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У ГЭТЫ СКЛАДАНЫ ЧАС І НА ГУБЕРНАТАРАХ ЛЯЖЫЦЬ АСАБЛІВЫ ГРУЗ АДКАЗНАСЦІ, ПЕРШ ЗА ЎСЁ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ НАШАЙ АГУЛЬНАЙ БЯСПЕКІ»

Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу з губернатарам Омскай вобласці

Перш чым абмеркаваць пытанні двухбаковага супрацоўніцтва і вызначыць перспектыўныя кірункі далейшага ўзаемадзеяння, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што менш за тыдзень прайшло пасля прэзідэнцкіх выбараў у Расіі. У асобе Віталя Хацэнкі кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх губернатараў Расійскай Федэрацыі з паспяховым вынікам, які наўрад ці быў бы магчымы без падтрымкі рэгіёнаў.

«Але, як паказвае час, расслабляцца нам ні ў якім разе нельга, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Нас будуць нахіляць, хістаць, ставіць на калені. Аб гэтым мы гаварылі з Прэзідэнтам Пуціным яшчэ напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. Спакойнага жыцця нам не дадуць. І гісторыі ўсё больш і больш будуць заблытанымі, складанымі, як паказалі, на жаль, апошнія падзеі ў Падмаскоўі».

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, у гэты складаны час і на губернатарах ляжыць асаблівы груз адказнасці, перш за ўсё па забеспячэнні нашай агульнай бяспекі. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што пасля трагедыі на працягу сутак ён быў на сувязі са сваім калегам Уладзімірам Пуціным. «Вельмі шчыльна працавалі. Чым гэта скончылася, вы ведаеце. Гэта акурат сведчыць аб тым, як павінны працаваць у нашай Саюзнай дзяржаве два прэзідэнты і нашы спецслужбы», — канстатаваў беларускі лідар.

«Рэзерваў звышдастаткова»

Вяртаючыся да тэмы двухбаковага ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Омскай вобласцю, Прэзідэнт адзначыў, што губернатару і членам дэлегацыі добра знаёмая наша краіна. «І гісторыяй сваёй, і знакамітымі людзьмі, і флагманамі нашай прамысловасці, — канкрэтызаваў ён. — Вы добра ведаеце сельскую гаспадарку Беларусі, паколькі сваю вельмі прыстойна развіваеце. І мы можам без усялякага прамаруджвання прыступіць да нашай справы. Мы можам многае зрабіць, — сведчаннем гэтаму з'яўляецца ваш прыезд. Гэта перш за ўсё мы расцэньваем як цікавасць да нашай краіны і цікавасць да развіцця будучыні паміж дзвюма дзяржавамі».

За 2023 год аб'ём узаемнага гандлю склаў звыш 110 мільёнаў долараў. «Досыць невялікі паказчык, і мы яго павінны сур'ёзна падцягнуць. Рэзерваў звышдастаткова», — лічыць беларускі лідар.

Кажучы аб канкрэтных пунктах росту гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, Аляксандр Лукашэнка спыніўся на магчымасцях Беларусі для супрацоўніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі. Прэзідэнта інфармуюць: у апошнія гады Омская вобласць дасягнула вельмі сур'ёзных поспехаў у аграрным сектары і ўваходзіць у лік рэгіёнаў-перадавікоў па вытворчасці прадукцыі АПК у Сібірскай федэральнай акрузе.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што гэты расійскі рэгіён таксама з'яўляецца адным з лідараў у Расіі па вырошчванні лёну-даўгунцу. «Сам Бог загадаў нам тут працаваць разам, паколькі, як вы ведаеце, у Беларусі гэтаму кірунку ўдзяляецца велізарная ўвага, — канстатаваў ён. — Мы заўсёды будзем удзяляць яму ўвагу, бо на гербе нашай краіны — у тым ліку і лён».

Прэзідэнт паведаміў, што Беларусь мае ўсе магчымасці закрыць патрэбы гэтага расійскага рэгіёна ў сучаснай і надзейнай тэхніцы па ўборцы лёну. У поўнай меры гэта адносіцца і да іншых брэндаў беларускага машынабудавання: трактароў, камбайнаў, якія добра вядомыя ў Расіі.

«Нашым вучоным ёсць над чым працаваць»

Аляксандр Лукашэнка добра знаёмы з той работай, якую ажыццяўляюць Нацыянальная акадэмія навук Беларусі і Омскі аграрны навуковы цэнтр у галіне вывучэння, захавання і выкарыстання генетычных рэсурсаў раслін. «Нашым вучоным ёсць над чым працаваць, — перакананы Прэзідэнт. — Галоўнае, каб гэта не былі даследаванні толькі дзеля даследаванняў. Эканоміка павінна штогод атрымліваць эфект ад іх вынікаў. Тым больш мы з году ў год павялічваем фінансаванне на гэтыя мэты ў рамках Саюзнай дзяржавы».

Кіраўнік дзяржавы цалкам падтрымлівае такое супрацоўніцтва і мяркуе, што бакам па сілах пашырыць спектр сартавыпрабаванняў розных культур, якія праводзяцца.

Адным з перспектыўных кірункаў супрацоўніцтва Беларусі і Омскай вобласці на злобу дня, па меркаванні Прэзідэнта, можа стаць імпартазамяшчэнне, у тым ліку ў сельскай гаспадарцы. Беларускія спецыялісты добра знаёмыя з прадпрыемствам «Омскі навукова-даследчы інстытут прыборабудавання», якое распрацавала аўтаматызаваную сістэму кіравання жывёлагадоўчымі гаспадаркамі «АСУ-АГРА».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што работа па яе ўкараненні на базе беларускага абсталявання вядзецца сёння з нашым прадпрыемствам — ААТ «Гомельагракамплект». У Расію ўжо пастаўлена 15 адзінак даільнага абсталявання. Як запэўніў кіраўнік дзяржавы, да чэрвеня гэтага года пасля тэставых выпрабаванняў яшчэ два камплекты паступяць у Омскую вобласць.

«Гэта будзе сумесны прадукт, выраблены з выкарыстаннем беларускага абсталявання і сістэмы кіравання, распрацаванай вашым НДІ, — удакладніў Прэзідэнт. — Аналагаў яму няма на постсавецкай прасторы, і мы разлічваем на вашу падтрымку ў прасоўванні гэтага сумеснага прадукту».

«Прыкладаў у галіне інвестыцыйнага супрацоўніцтва будзе ўсё больш»

Яшчэ адным з прыкладаў двухбаковага паспяховага інвестыцыйнага ўзаемадзеяння з'яўляецца сумесны праект, які рэалізоўваецца ў Магілёве, — «Омск Карбон Магілёў». Як расказаў кіраўнік дзяржавы, першапачаткова прадпрыемства было арыентавана на пастаўку прадукцыі ў Заходнюю Еўропу, але пасля ўведзеных санкцый здолела ў найкарацейшыя тэрміны зрушыць вектар продажаў у азіяцкія рэгіёны.

«Экспартныя пастаўкі ажыццяўляюцца больш як у 15 краін, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Блізіцца да завяршэння будаўніцтва трэцяга, чацвёртага тэхналагічных патокаў, увод у эксплуатацыю якіх забяспечыць вытворчасць 200 тысяч тон тэхнічнага вугляроду ў год. Спадзяюся, такіх прыкладаў у галіне інвестыцыйнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і вашай вобласцю будзе ўсё больш».

Прэзідэнт нагадаў, што паказальным прыкладам партнёрства ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі з'яўляецца работа ААТ «Магілёўліфтмаш». «Гэты вытворца вам добра вядомы, — удакладніў ён. — Мяне інфармуюць: толькі ў мінулым годзе забяспечаны пастаўкі ў ваш рэгіён больш за 300 беларускіх ліфтаў. Гэта, вядома, мала. Мы ведаем, што такое ліфты: іх мяняць трэба. І прычым аднаасова. Прыйшоў час, калі іх трэба мяняць і ў Беларусі, і ў іншых постсавецкіх дзяржавах».

Омская вобласць зацікаўлена і ў камунальнай і дарожна-будаўнічай тэхніцы, якая вырабляецца на ААТ «Амкадор». Прэзідэнт падкрэсліў, што прадпрыемства паспяхова рэалізоўвае шэраг праектаў, павялічваючы выпуск тэхнікі без дэталяў заходняй вытворчасці, і гатова ў найкарацейшыя тэрміны яе паставіць.

Па словах кіраўніка дзяржавы, акрамя вытворчай кааперацыі, гандлю і інвестыцый, важна падтрымліваць кантакты паміж жыхарамі Беларусі і рэгіёна, пашыраць супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы — у культуры, адукацыі, спорце. «Асабліва тэма — сумесная работа па захаванні гістарычнай праўды і памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, — дадаў ён. — Многія ўраджэнцы вашай зямлі прымалі ўдзел у разгроме ворага. На жаль, загінулі, пахаваны ў Беларусі. Праводзім вялікую практычную работу па дакументаванні, увекавечанні. Запрашаем навукоўцаў, даследчыкаў з вашага рэгіёна падключыцца да гэтай важнай місіі».

Рэзюмуючы сказанае, Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь адкрыта да абсалютна прадметнай размовы па розных кірунках. «Можаце разлічваць на нас ва ўсіх без выключэння сферах супрацоўніцтва, — адзначыў ён. — Думаю, што ёсць магчымасць цяпер і ва ўрадзе, на прадпрыемствах, дзе вы захочаце пабываць, абмеркаваць усе гэтыя тэмы і прыняць адпаведныя рашэнні».

У якасці кіраўніка гэтага расійскага рэгіёна Віталь Хацэнка ў Беларусі ўпершыню. Праграма рабочага візіту ў нашу краіну насычаная. На прылёце ў Мінск губернатар і члены дэлегацыі наведалі Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь», усклалі вянок да манумента Перамогі ў сталіцы.

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам нашай краіны дэлегацыя Омскай вобласці правяла перагаворы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам. На парадку дня — і пасяджэнне Сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным і інвестыцыйным супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Омскай вобласцю пад кіраўніцтвам старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра Турчына. Падчас наведвання гасцямі Магілёўскай вобласці прадугледжаны перагаворы са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Анатолем Ісачанкам. У рамках сустрэчы запланавана падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Магілёўскім абласным выканаўчым камітэтам і ўрадам Омскай вобласці ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, сацыяльнай, культурнай і іншых сферах. У Магілёве прадстаўнікі расійскага рэгіёна наведаюць шэраг прадпрыемстваў. Па вяртанні ў Мінск запланаваны візіты ў спартыўна-стралковы комплекс імя маршала Савецкага Саюза С. Цімашэнкі, Першы нацыянальны гандлёвы дом, ААТ «Амкадор», Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

У размове з журналістамі **губернатар Омскай вобласці Віталь ХАЦЭНКА** адзначыў, што падчас сустрэчы з кіраўніком нашай дзяржавы былі абмеркаваны шматлікія кірункі супрацоўніцтва. «Гэта і працяг развіцця нашай кампаніі па вытворчасці вугляродаў на тэрыторыі Беларусі «Омск Карбон Магілёў», — канкрэтызаваў ён. — Мы ствараем вялікі мультыбрэндавы цэнтр шматлікіх відаў тэхнікі машынабудаўнічых прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі горада Омска. Гэта і МТЗ, і «Гомсельмаш», і «Амкадор», і МАЗ — адпаведна, будзем рэалізоўваць гэты праект».

Наступны сумесны праект, які абмеркавалі падчас сустрэчы з кіраўніком дзяржавы, — гандлёвы дом беларускіх тавараў на тэрыторыі Омскай вобласці, дзе будуць прадстаўлены прамысловыя тавары, прадукцыя аграпрамысловага комплексу, што будзе рэалізоўвацца на тэрыторыі гэтага расійскага рэгіёна.

«Кажучы ў цэлым аб эканамічным патэнцыяле, Рэспубліка Беларусь традыцыйна займала пятае месца (па аб'ёме тавараабароту. — **«Зв.»**) да 2022 года ўключна, — паведаміў Віталь Хацэнка. — Падведзены вынікі мінулага года, і Беларусь выйшла на чацвёртае месца пасля Казахстана (у нас граніца з гэтай краінай — звыш тысячы кіламетраў), Кітая і Турцыі. Мы бачым, што патэнцыял тавараабароту можна і далей павялічваць. Значна павялічыць яго — у два-тры разы — можна за найбліжэйшую пяцігодку».

Губернатар Омскай вобласці адзначыў, што вельмі прыстойна прадстаўлена санаторна-курортнае лячэнне Беларусі, што выклікае цікавасць у жыхароў гэтага рэгіёна. На сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі таксама абмяркоўвалася магчымасць арганізацыі прамога авіярэйса Мінск — Омск пачынаючы з 2025 года. «Падбіраем кампанію, якая магла б лятаць па гэтым авіямаршруце, — дадаў кіраўнік расійскага рэгіёна. — Будзем усё рабіць, каб такі рэйс у нас быў».

Віталь Хацэнка звярнуў увагу на тое, што складаныя часы ў гісторыі абедзвюх краін былі заўсёды. «Толькі ў адзінстве падыходаў, ва ўзаемадзеянні, у тым ліку чалавечым, кааперацыі прамысловай, культурнай — наша сіла, — падкрэсліў ён. — І Прэзідэнт Беларусі казаў, што мы, па сутнасці, адзін народ — з адной велізарнай гісторыяй, традыцыямі, сур'ёзным сёння і вялікай будучыняй».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Вытворчасць электронных адходаў перавысіла 60 мільёнаў тон

У 2022 годзе ва ўсім свеце ўтварыліся рэкордныя 62 мільёны тон электронных адходаў, што на 82 працэнты больш, чым у 2010-м. Пры гэтым да 2030-га іх гадавая вытворчасць узрасце яшчэ на траціну — да 82 мільёнаў тон. Несучашальную статыстыку прыводзяць у сваім сумесным дакладзе Міжнародны саюз электрасувязі і Навучальны і навукова-даследчы інстытут ААН. Выкінутай у 2022 годзе электронікі хапіла б, каб запоўніць 1,55 мільёна 40-тонавых грузавікоў, якія, выстраіўшыся адзін за адным, утварылі б лінію даўжынёй з зямны экватар, вынікае са справаздачы.

У Еўропе адзначаецца ўздым захворвання на коклюш

Па ўсёй Еўропе адзначаецца ўздым захворвання на коклюш, у прыватнасці новыя выпадкі рэгіструюцца ў Чэхіі і Нідэрландах, паведаміла «Бі-бі-сі». Паводле інфармацыі чэшскіх улад, калі ў пачатку гэтага года ў краіне было пацверджана 28 выпадкаў коклюшу, то, паводле апошніх даных, колькасць захворванняў перавысіла тры тысячы чалавек. Такой колькасці інфіцыраваных у краіне не выяўлялася з 1963 года. Адным з хворых аказаўся 80-гадовы мэр Прагі Багуслаў Свабода, які з'яўляецца дэпутатам, а таксама вядомым гінеколагам.

У Аўстраліі выяўлена дагэтуль невядомае насякомае

Энтамолаг з аўстралійскага штата Квінсленд выявіў раней невядомае навуцы насякомае, якое некаторыя празвалі «жуком-панкам» за белае валасяное покрыва, якое нагадвае іракез. Аўтар знаходкі Джэймс Твід распавёў «Бі-бі-сі», што знайшоў жука падчас турыстычнай паездкі з палаткай у Паўднёва-Усходні Квінсленд і спачатку прыняў яго за птушыны памёт. «Гэта ўнікальная істота. Ёсць вельмі няшмат насякомых, якія валодаюць падобнымі якасцямі», — кажа Твід.

Наш агульны боль

Трагедыя, якая здарылася ў падмаскоўным Краснагорску, не пакінула раўнадушным, напэўна, нікога. Сам тэракт — бязглуздзі і ад таго яшчэ больш жахлівы. Выradкі з аўтаматамі — малодшаму ўсяго дзевятнаццаць — ішлі забіваць людзей проста за грошы.

Фота Віктара ДРАЧОВА.

У дзень памяці аб трагедыі Хатыні зладзілі, як сказаў пасол Расіі ў Беларусі Барыс Грызлоў у першыя гадзіны пасля паведамлення аб тэракце, новую Хатынь. Людзей расстралялі, пасля падпалілі, а тым, хто спрабаваў уратавацца, стралялі ва ўпор у спіны — аб гэтым ужо сведчаць і эксперты. Сто трыццаць сем чалавек забітых. І гэта лічба не апошняя, бо яшчэ працягваюць разбіраць завалы. Яшчэ больш пацярпелых. Сярод загінулых ёсць грамадзянка Беларусі, сярод пацярпелых — жыхар Бабруйска. За яго жыццё цяпер змагаюцца маскоўскія ўрачы. Зрэшты, тут справа не ў грамадзянстве і нацыянальнасці. Яны ўсе — бязвінныя ахвяры, забітыя і пакалечаныя нелюдзямі, у якіх таксама няма нацыянальнасці.

Падобныя жудасныя трагедыі — гэта яшчэ і заўсёды праверка астатніх людзей на чалавечнасць. Беларусы гэты экзамен з годнасцю чарговы раз вытрымалі. Ад Прэзідэнта, які пастаянна быў на сувязі са сваім расійскім калегам, да простых людзей, якія ўжо ў ноч з пятніцы на суботу пачалі несці да расійскага пасольства ў Мінску лампады і кветкі. Не толькі ў сталіцы, у іншых нашых гарадах людзі ішлі і працягваюць ісці да стыхійных мемарыялаў, каб падзяліць боль, каб выказаць спачуванні.

Праверка на чалавечнасць самая важная. І вытрымалі яе не ўсе, што найбольш прыкра — гэта нашы суседзі. У Рызе забаранілі прыносіць кветкі да пасольства. Украінскія геймеры стварылі камп'ютарную гульню з назвай канцэртнай залы, у якой бязвінныя людзі прынялі пакутніцкую смерць, і ў ёй гулец — у ролі тэрарыста... Бог ім суддзя. Хоць вельмі хочацца, каб дачакаліся яны і суда чалавечага...

Фота Андрэя ФЕДЧЫСТАВА.

«ГЭТАМУ ЖАХЛІВАМУ ЗЛАЧЫНСТВУ СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ НЯМА І НЕ МОЖА БЫЦЬ НІЯКАГА АПРАЎДАННЯ»

У сувязі з тэрактам у Падмаскоўі ў Пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Мінску адкрыта Кніга спачуванняў. Вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі дзяржаўных органаў, рэлігійных канфесій, прадстаўнікі дыпламатычных місій, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў пакідаюць у ёй свае запісы.

Фота БелТА.

Спікеры парламента Наталля Качанава, Ігар Сергеенка, а таксама папярэдні Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка прыбылі ў расійскае пасольства разам.

«Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з глыбокім болем успрынялі вестку аб жорсткім крывавым тэрарыстычным акце ў канцэртнай зале «Крокус Сіці Хол», у выніку якога загінулі і пацярпелі ні ў чым не вінаватыя людзі», — адзначана ў запісе, які пакінула Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла, што гэтае зверскае злачынства ўзрушыла і шакавала ўсю Беларусь. «Пачуцці, слёзы і горыч, якія перапаўняюць беларускіх грамадзян, увасобіліся ў шматлікія спантанныя акцыі салідарнасці і сцены смутку, сардэчную падтрымку з усіх куткоў нашай краіны. Гэтаму жахліваму злачынству супраць чалавечнасці няма і не можа быць ніякага апраўдання. Вінаватыя павінны панесці заслужанае пакаранне. Смуткуем аб ахвярах тэракта і спадзяёмся на больш хуткае выздараўленне пацярпелых. У гэты найскладанейшы час жадаем усім устойлівасці духу, сіл і мужнасці. Беларусь разам з вамі!» — адзначана ў паведамленні.

Ад імя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і ад сябе асабіста спікер ніжняй палаты парламента Ігар Сергеенка выказаў шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых, пажадаў найхутчэйшага выздараўлення пацярпелым. У Кнізе спачуванняў Старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што беларускія дэпутаты, як і ўвесь народ Беларусі, з болем успрынялі вестку аб жахлівым тэракце ў канцэртнай зале «Крокус Сіці Хол» у Падмаскоўі, які прывёў да шматлікіх чалавечых ахвяр, сярод якіх ёсць дзеці.

«У гэты цяжкі час разам з расіянамі нас перапаўняюць пачуцці смутку і спагады, — адзначана ў запісе. — Рашуча асуджаем забойства мірных грамадзян і заяўляем, што тэрарызму не можа быць ніякага апраўдання». Ігар Сергеенка перакананы, што ўсе адказныя за планаванне, арганізацыю і ажыццяўленне гэтага варварскага злачынства панясуць няўхільнае пакаранне.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў чацвёртага, пятага, шостага і сёмага склікання Уладзімір Андрэйчанка ў сваім запісе адзначыў: «Гэты акт тэрарызму, які прывёў да шматлікіх чалавечых ахвяр, не павінен застацца беспакараным. Выказваю самыя шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых, жадаю хутчэй акрыяць пацярпелым».

«Смуткуем разам з вамі»

Першы намеснік генеральнага сакратара СНД Леанід Анфімаў, пакінуўшы запіс у кнізе спачуванняў, акцэнтаваў увагу на важнасці дасканалага расследавання ўчыненага злачынства. «У такую хвіліну вельмі складана гаварыць, — паведаміў ён. — Гэтую жахлівую акцыю, якую ўчынілі тэрарысты, спрабуючы запалохаць прагрэсіўнае чалавецтва, немагчыма неяк апраўдаць або растлумачыць. Гэта было проста паляванне на людзей. Інакш як сярэднявечным варварствам гэта назваць немагчыма. Звяры так не робяць, як зрабілі гэтыя людзі».

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка ў Кнізе спачуванняў адзначыў, што глыбокім болем адгукнулася ў нашых сэрцах трагедыя ў Падмаскоўі. «Выказваем салідарную падтрымку брацкаму народу Расіі. Смуткуем і молімся па бязвінна забітых у выніку тэрарыстычнага акта. Жадаем найхутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым. У адзінстве і сяброўстве народаў — наша сіла і праўда!» — лічыць старшыня ЦВК.

У Кнізе спачуванняў прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар Лукашэнка адзначыў: «Жудасная трагедыя! Мы побач з нашымі братамі-расіянамі! Глыбокія спачуванні сем'ям, родным і блізкім загінулых! Упэўнены, што кампетэнтныя органы ўстановяць і знойдуць усіх вінаватых. І гэтыя злачынцы панясуць заслужаную кару!»

У сваім запісе міністр абароны Віктар Хрэнін паведаміў, што з глыбокім болем і смуткам успрыняў вестку аб тэракце ў Падмаскоўі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі. «Тая трагедыя — гэта наш агульны боль, і ў гэтую цяжкую хвіліну мы падзяляем горыч страты і смуткуем разам з вамі, — паведаміў кіраўнік абароннага ведамства ў Кнізе спачуванняў. — Ад імя Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь і сябе асабіста выказваю глыбокія спачуванні брацкаму расійскаму народу, родным і блізкім загінулых у выніку гэтай трагічнай падзеі».

«Гэта нелюдзі! Яны не могуць быць мусульманамі»

Свой запіс у Кнізе спачуванняў унёс і старшыня Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі муфцій Абу-Бекір Шабановіч. У размове з журналістамі ён падкрэсліў, што выканаўцы тэракта ў Падмаскоўі не могуць лічыцца мусульманамі. «Усе мусульмане свету сёння ажыццяўляюць пакланенне Усявышняму, здзяйсняюць добрыя справы па ўсіх жыццёвых кірунках, — паведаміў ён. — Свяшчэнны месяц Рамадан, і акурат сярэдзіна яго, азмрочаны такім страшным учынкам. І папярэдне мы бачым, што гэта прадстаўнікі мусульманскага свету. У той час, калі ў свяшчэнны месяц Рамадан ад кожнага верніка патрабуецца ачысціцца ад сваіх негатыўных рыс, для таго каб заслужыць узнагароду ад Усявышняга, адбылася такая страшная падзея — забойства сотняў людзей. Мы не ўяўляем, што гэта мусульмане. Гэта нелюдзі! Яны не могуць быць мусульманамі».

Абу-Бекір Шабановіч адзначыў, што Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне Беларусі, як і ўсё насельніцтва краіны, смуткуе па ахвярах тэракта. «Вядома, мы робім высновы, якім павінен быць сучасны чалавек, чым ён павінен займацца, як ён павінен жыць, наладжваць адносіны з усімі роўнымі боскімі стварэннямі, — дадаў ён. — Мы смуткуем, мы выкрываем такія ўчынкі. Яны нецярпімыя. Яны не належаць наогул чалавеку. Выказваем спачуванні родным і блізкім ахвяр. Будзем гаварыць у нашых пропаведзях аб недапушчальнасці такога негатыву. Я шчыра буду прасіць усіх нашых людзей жыць у міры, згодзе, да чаго заклікаюць усе сусветныя рэлігіі».

Вераніка КАНЮТА.

Адкрыты дыялог

Помніць мінулае — берагчы будучыню

На мінулым тыдні ў Віцебскім дзяржуніверсітэце імя П. М. Машэрава адбылася дыялогавая пляцоўка «Генацыд беларускага народа: памяць і боль віцебскай зямлі». У размове са студэнтамі ўзялі ўдзел прадстаўнікі пракуратуры паўночнага рэгіёна, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Віцебскай вобласці, а таксама кіраўнікі і педагогі ВНУ.

«Як аказалася, у нашай краіне вырасла не адно пакаленне, якое проста не ведае праўды аб самай страшнай вайне ў гісторыі чалавецтва, калі генацыд быў узведзены ў разрад дзяржаўнай палітыкі асобных краін цяперашняга «калектыўнага Захаду». Сярод беларускай моладзі, чые розумы і сэрцы, у першую чаргу, зведвалі негатыўнае ўздзеянне, распальвалася варожасць па палітычных і ідэалагічных матывах, злачыннасць нацызму нівеліравалася. І толькі дзякуючы своечасоваму ўмяшанню дзяржавы дадзеная тэндэнцыя ў Рэспубліцы Беларусь не набыла масавы характар», — звярнуўся да ўдзельнікаў дыялогавай пляцоўкі **пракурор Віцебскай вобласці Ігар УКРАІНЕЦ.**

Ён расказаў прысутным, што падчас расследавання злачынстваў нямецка-фашысцкіх акупантаў і каларацыяністаў высветлілася, што ў гады акупацыі на тэрыторыі нашай краіны забілі тры мільёны чалавек і больш за 300 тысяч сагналі ў рабства. Больш за 200 гарадоў былі разбураны. У 1944 годзе ў Віцебску менш як 120 чалавек сустракалі пераможцаў. Калі гаварыць пра матэрыяльны ўрон, у сённяшнім эквіваленце ён складае звыш 2,3 трыльёна долараў.

У ходзе следства па крымінальнай справе па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, якое працягваецца больш за два гады, устанаўліваюцца новыя факты жахлівых злачынстваў нацыстаў на беларускай зямлі. Беларусь пазнала ўсе формы генацыду, прадугледжаныя Канвенцыяй ААН «Аб папярэджанні злачынстваў генацыду і пакаранні за яго». У рамках шырокамаштабнай работы па выхаванні грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, у першую чаргу, моладзі ў духу патрыятызму арганізоўваюцца наведванні месцаў правядзення пошукавых мерапрыемстваў. Працягваецца работа і па ўвекавечанні памяці загінулых мірных жыхароў і абаронцаў Айчыны, захаванні гістарычнай праўды, недапушчэнні гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых.

Як адзначыў **начальнік упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Віцебскай вобласці Андрэй ПАЗНЯКОЎ,** напярэдадні святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мы ўсе павінны прыкласці максімум намаганняў, каб захаваць, усё, што маем.

Рэктар навучальнай установы Валянціна БАГАТЫРОВА, звяртаючыся да сваіх студэнтаў, падкрэсліла: факты генацыду трэба вывучыць і запомніць. Гэта дапаможа зразумець важнасць міру і стабільнасці. «У нашай дзяржаве створаны ўсе магчымасці для таго, каб жыць годна, атрымліваць адукацыю, рэалізоўваць сябе ў прафесіі і грамадскім жыцці», — заключыла Валянціна Васільеўна.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота «Витебские вести».

КОСМАС — НАШ!

Храналогія старту касмічнага карабля, у складзе экіпажа якога беларуска Марына Васілеўская, вачыма нашага фотакарэспандэнта Віктара ІВАНЧЫКАВА, які быў непасрэдна на месцы падзеі.

НАША ЛІЧБАВАЯ БУДУЧЫНЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета НЦЭП адзначыў сваё 12-годдзе. РУП «Нацыянальны цэнтр электронных паслуг» было створана ў адпаведнасці з Указам № 515 «Аб некаторых пытаннях развіцця інфармацыйнага грамадства ў Рэспубліцы Беларусь». Дакументам пастаўлены шэраг задач і вызначаны шэраг функцый, за якія адказвае цэнтр. Гэта, у прыватнасці, развіццё інфраструктуры электроннага ўрада, электронных сэрвісаў і архіваў, электроннага дакументаабароту, аказанне дзяржаўных лічбавых паслуг бізнесу і грамадзянам. Сёння Нацыянальным цэнтрам электронных паслуг створана сетка з 44 пунктаў аказання паслуг на базе 12 рэгістрацыйных цэнтраў, размешчаных у буйных гарадах, расказалі прадстаўнікі НЦЭП на прэс-канферэнцыі «12 гадоў ствараем лічбавую будучыню».

ШТО ТАКОЕ ЭЛЕКТРОННЫ ЎРАД

Сучаснае інфармацыйнае грамадства чакае ад урада простага, камфортнага, хуткага і эфектыўнага ўзаемадзеяння з грамадзянамі і бізнесам. Такое ўзаемадзеянне забяспечвае электронны ўрад — сістэма дзяржаўнага кіравання, заснаваная на аўтаматызацыі кіраўніцкіх працэсаў у маштабах краіны.

— У аснове электроннага ўрада ляжыць анлайн-узаемадзеянне, якое паскарае прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў, — тлумачыць **дырэктар Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг Раман ГРАДУСАЎ**. — У нашай краіне для такога ўзаемадзеяння была створана сістэма міжведамаснага дакументаабароту. Абанентамі яе з'яўляюцца больш за 16 800 дзяржаўных органаў і арганізацый, а таксама суб'екты гаспадарання з іншай формай уласнасці, якія ацанілі зручнасць электроннага ўзаемадзеяння, у тым ліку юрыдычна значнага. У сістэме за тыдзень перасылаецца каля 150 тысяч электронных дакументаў.

У мінулым годзе НЦЭП было таксама прапанавана рашэнне па электронным дакументаабароце для невялікіх кампаній, расказаў кіраўнік цэнтра электронных паслуг. Звесткі, што паступаюць у асабісты кабінет грамадзяніна ад дзяржаўных органаў на Адзіным партале дзяржпаслуг, надзелены юрыдычнай сілай. Хутка ў агульным доступе з'явіцца таксама сэрвіс праверкі электронных дакументаў, дзе можна будзе пераканацца ў іх сапраўднасці.

Адзін з ключавых кірункаў работы НЦЭП — развіццё, распрацоўка і аказанне электронных паслуг для грамадзян, бізнесу, дзяржаўных органаў і арганізацый.

— Мы імкнёмся, каб колькасць электронных паслуг павялічвалася, яны былі запатрабаваны і дазвалялі як фізічным асобам, так і суб'ектам гаспадарання вырашаць надзённыя праблемы або жыццёвыя сітуацыі з найменшай затратай сіл і часу, у ідэале — на ўзроўні пары клікаў, — падкрэсліў Раман Градусаў. — Калі ў 2022 годзе было рэалізавана каля 40 электронных сэрвісаў, з іх — дзве адміністрацыйныя працэдуры, то за 2023 год намі сумесна з дзяржорганамі рэалізавана ўжо больш за 270 сэрвісаў, з якіх каля 230 — менавіта адміністрацыйныя працэдуры для грамадзян і суб'ектаў гаспадарання. Цяпер на Адзіным партале электронных паслуг можна атрымаць больш за 560 розных паслуг, большасць з якіх — адміністрацыйныя працэдуры.

«Сэрца» Адзінага партала электронных паслуг — асабісты кабінет грамадзяніна. Яго актывацыя адбываецца пры першым уваходзе з дапамогай электроннага лічбавага подпісу, а функцыянал вельмі шырокі. І цікавасць да выкарыстання асабістых кабінетаў пастаянна расце, падкрэслілі спецыялісты НЦЭП. Так, калі ў 2022 годзе праз партал было аказана крыху больш за 76 млн паслуг, то за мінулы год — ужо каля 128 млн. У сярэднім штомесяц праз Адзіны партал электронных паслуг аказваецца каля 11,5 млн паслуг.

ШТО ЗАПАТРАБАВАНА?

За амаль тры месяцы бягучага года на Адзіным партале электронных паслуг былі рэалізаваны 34 новыя электронныя сэрвісы, расказала **начальнік аддзела электроннай камерцыі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг Святлана КАРАНЕВІЧ**. Тры электронныя сэрвісы — для грамадзян, астатнія — для суб'ектаў гаспадарання.

— Такім чынам, яшчэ 34 дзеяльныя або жыццёвыя сітуацыі цяпер могуць быць вырашаны без таго, каб ісці ва ўпаўнаважаны орган з пакетам дакументаў, — падкрэсліла спікер. — У прыватнасці, для суб'ектаў гаспадарання з'явілася магчымасць анлайн атрымліваць фітасанітарныя сертыфікаты ў дачыненні да прадукцыі, якая вывозіцца за межы Беларусі. Цяпер можна таксама анлайн атрымаць сертыфікат адпаведнасці збожжа, мукі, круп, якія накіроўваюцца на экспарт або ўвозяцца на тэрыторыю Беларусі, і гэтак далей. Што датычыцца фізічных асоб, новыя электронныя паслугі для іх — гэта анлайн-атрыманне даведак аб аднясенні да беспрацоўных, аб памеры налічаных сацыяльных дапамог і аб памеры пенсіі.

Значная колькасць адміністрацыйных працэдур была пераведзена ў «лічбу» летась, паведаміла Святлана Мікалаеўна. Сярод іх — больш за 120 адміністрацыйных працэдур у сферы зямельна-маёмасных адносін. Цяпер, не звяртаючыся «фізічна» ва ўпаўнаважаныя рэгістравальныя органы, можна рэгістраваць дагаворы куплі-продажу нерухомасці або свае правы на нерухомасць.

— Многія дзяржаўныя структуры сёння адмаўляюцца ад папяровых даведак, выпісак, сведчанняў, — распавяла Святлана Караневіч. — Напрыклад, Міністэрства эканомікі заканадаўча ўстанавіла, што ўсе ліцэнзіі знаходзяцца ў Адзіным рэестры ліцэнзій у электронным выглядзе. Па гэтым шляху рухаюцца і іншыя дзяржорганы.

Менавіта алічбоўванне адміністрацыйных працэдур, як для суб'ектаў гаспадарання, так і для грамадзян, сёння — прыярытэтны кірунак работы НЦЭП. Усяго такіх працэдур у краіне каля 1000, і ў бліжэйшыя гады ўсе яны будуць алічбаваны. Летась, расказала Святлана Караневіч, у электронны від было пераведзена больш як 200 працэдур, сёлета запланавана алічбаваць яшчэ 140.

Што датычыцца папулярнасці электронных паслуг у беларусаў, то асабліва запатрабаваныя тыя, якія былі ўведзены ў мінулым годзе, звярнула ўвагу начальнік аддзела электроннай камерцыі.

— Напрыклад, паслуга праходжання электроннай дыспансерызацыі. Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла правілы: кожны штогод павінен прайсці дыспансерызацыю аднаго дня. Чалавек прыходзіць да тэрапеўта і атрымлівае лісток з рэкамендацыямі, каго са спецыялістаў неабходна прайсці ў адпаведнасці са станам здароўя. А каб урач мог аданіць стан вашага здароўя, вы павінны запоўніць анкету з больш як 30 пытаннямі. Сумесна з Міністэрствам аховы здароўя распрацавана магчымасць на Адзіным партале электронных паслуг прайсці такое анкетаванне анлайн. Анкеты паступаюць вашаму тэрапеўту ў асабісты кабінет. Электронных дыспансерызацый у мінулым годзе было пройдзена амаль 4 мільёны.

Яшчэ адна паслуга, якая карыстаецца попытам, — праверка наяўнасці або адсутнасці правоў на кіраванне транспартным сродкам, расказала спецыяліст. Паслуга асабліва актуальная для каршэрынгавых кампаній, а таксама кампаній-перавозчыкаў.

А ў цэлым паслугі на Адзіным партале штомесяц з'яўляюцца ў розных сферах: сацыяльная абарона, праца, падаткі, транспарт... Але мноства ўсё яшчэ застаюцца даступнымі толькі ў афлайне. Для аўтаматызацыі працы службаў «Адно акно» створаны аднайменны праграмны комплекс, адзначыла спікер. У ім рэалізуецца каля 300 адміністрацыйных працэдур, якіх пакуль няма на Адзіным партале.

— Праграмны комплекс дазваляе цалкам аўтаматызаваць працу аператара сістэмы «Адно акно», а таксама атрымаць дадатковыя даныя ў дачыненні да вашай сітуацыі. Напрыклад, вы звярнуліся па адміністрацыйную працэдуру ў Мінску, але частку дакументаў трэба атрымаць у іншым населеным пункце краіны. Цяпер ехаць нікуды не спатрэбіцца: электронны запыт можна зрабіць праз праграмны комплекс «Адно акно» і атрымаць інфармацыю з тых рэсурсаў, якія інтэграваныя з комплексам. На сёння ўжо ўсе службы «Адно акно» падключаны да сэрвісу, а да 1 ліпеня падключацца іншыя дзяржорганы і арганізацыі, якія ўпаўнаважаны на прыём і разгляд заяў грамадзян або суб'ектаў гаспадарання.

У МАБІЛЬНЫМ ФАРМАЦЕ

Відавочна, што доступ да Адзінага партала электронных паслуг і большасці яго сэрвісаў патрабуе адназначнай і строгай ідэнтыфікацыі карыстальнікаў, адзначыў **намеснік дырэктара па інфармацыйных тэхналогіях Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг Ягор ВОРАНАЎ**. На гэта накіравана Адзіная сістэма ідэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб, якая дазваляе з дапамогай электроннага лічбавага подпісу аўтарызавацца на партале. Носьбітам лічбавага подпісу можа быць і звычайная «флэшка», але выкарыстанне ID-карт дае магчымасць аўтаматызаваць працэдуру ідэнтыфікацыі асобы.

— ID-карта — не толькі дакумент, які сведчыць асобу, але і носьбіт двух дадаткаў: ідэнтыфікацыйнага і электроннага лічбавага подпісу, — расказаў спецыяліст. — З яе дапамогай карыстальнік атрымлівае доступ да свайго асабістага кабінета і магчымасць замовіць любую паслугу, якую прапануе партал. Дамен і імя партала ў сетцы Інтэрнэт — E-паслуга.by, і мы чакаем, што карыстальнікі праявяць да яго цікавасць, — дадаў Ягор Воранаў. — У канцы 2023 года была праведзена маштабная работа па рэбрэндынгу і мадэрнізацыі нашага партала, абноўлены карыстальніцкі інтэрфейс. Рэбрэндынг закрануў і мабільны дадатак E-паслуга, які быў распрацаваны, каб спрасціць карыстальнікам працэдуру аўтарызацыі.

Адным з патрабаванняў да працы з ID-картай з'яўляецца наяўнасць дадатковай прылады — «счытвальніка», што не заўсёды зручна. Мабільны дадатак дазваляе абысціся без «рыдэра» — патрэбен толькі смартфон з функцыяй NFC, які будзе працаваць замест счытвальніка. Калі прыкласці ID-карту да тыльнага боку смартфона, адбудзецца строгая і адназначная аўтарызацыя карыстальніка ў «E-паслузе», адзначыў спікер.

Сёння дадатак «E-паслуга» ёсць у Google Play і можа быць установлены на Android. Спецыялісты пашыраюць пункты запампоўкі дадатку. За два месяцы спампоўка мабільнага дадатку «E-паслуга» дасягнула больш за 3000, распавёў прадстаўнік НЦЭП. Ён адзначыў рост цікавасці грамадзян Беларусі як да мабільнага дадатку, так і да Адзінага партала дзяржаўных паслуг, і да тых электронных сэрвісаў, якія прапануе рэсурс.

У планах на будучыню Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг — зрабіць упор на прапанову сэрвісаў і паслуг не па заяўным, а па выяўленчым прынцыпе. Напрыклад, нараджэнне дзіцяці патрабуе ад бацькоў выканання шэрагу дзеянняў: рэгістрацыя ў ЗАГСе, пастаноўка на ўлік у дзіцячую паліклініку, неабходнасць заняць чаргу ў дзіцячы садок... Гэтыя паслугі ў анлайн-фармаце маладым бацькам будуць прапаноўвацца аўтаматычна. Напрыклад, ім будзе прапанавана некалькі варыянтаў дзіцячых садкоў, з якіх яны змогуць выбраць аптымальны для іх. Гэтак жа варыянты чалавек будзе атрымліваць пры пераездзе, рэгістрацыі юрыдычнай асобы і гэтак далей. Яшчэ адзін кірунак працы — «воблачны» лічбавы подпіс, які стане даступным інструментам ідэнтыфікацыі суразмоўніка пры электронных зносінах.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by	
Продавец	ООО «Западная Рыбная компания – БЕЛ», г. Минск, ул. Леонида Беды, д. 33, пом. 226	
Предмет электронных торгов: изолированные помещения, реализуемые одним лотом	Общ. пл., кв. м	Адрес
Административно-торговое помещение (административно-торговое помещение), инв. номер 500/D-708162882	173,1	г. Минск, ул. Леонида Беды, д. 33-232
Торговое помещение (торговое помещение), инв. номер 500/D-708145912	472,1	г. Минск, ул. Леонида Беды, д. 33-228
Подсобное помещение (помещение неустановленного назначения), инв. номер 500/D-708145910	84,7	г. Минск, ул. Леонида Беды, д. 33-226

Начальная цена с НДС 20 % – 1 560 000,00 долл. США* (цена продажи предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения торгов)

Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 %** от цены продажи лота в течение 3-х рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.04.2024 г. с 11.00 до 13.00
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.04.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества **ООО «БЕССЕР-БЕЛ»** (Продавец)

Аукцион состоится **26.04.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1, в составе:

1. Грузовой седельный тягач DAF TE95XF,
кузов (рама) XLRTE47XS0E639472, г. в. – 2004.

2. Полуприцеп специальный бортовой с гидроманипулятором KOEGEL SN24,
кузов (рама) WK0S0002400075923, г. в. – 2006.

Начальная цена с НДС 20 % – 171 000,00 руб.
Задаток – 15 000,00 руб.
Шаг аукциона – 2 %.

Местонахождение Лота № 1: г. Минск, ул. Монтажников, 21.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 24.04.2024 г. в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

УНП 201028245

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ АУКЦИОНА

по продаже Лота № 1: автомобиль грузовой фургон (FURGON) GAZ A32R22, год выпуска 2019 г., регистрационный знак АН 1747-1, кузов № X96A32R22K0879284 / A32R23K0029046 с продажи. Аукцион по продаже имущества, принадлежащего КУП «БрестОблУКС», назначен на 02.04.2024

Телефоны для справок: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Извещение о продаже имущества опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2024

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by
Продавец	Гражданин Республики Беларусь Гагин Егор Николаевич

Предмет электронных торгов: квартира, инв. номер 500/D-708165383, общей площадью 134,4 кв. м (с учетом площади террасы), по адресу: г. Минск, ул. Кирилла Туровского, 6-3	**Начальная цена без НДС – 699 000,00 бел. руб.**

Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: в течение **15 (пятнадцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3-х рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **29.04.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.04.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТРЕТЬИХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Аукцион состоится **05.04.2024 г.,** начало: **10.00,** окончание: **16.00** на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) **iintorgi.by.** Время приема заявок: **с 26.03.2024 09.00 до 04.04.2024 г. 17.00**

Организатор аукциона, оператор ЭТП:
ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец: ООО «Металлстройпрофиль», 223058, Минская обл., Минский р-н, с/с Боровлянский, д. 62, каб. 55 (район д. Лесковка)

Информация о предмете

(9 изолированных помещений и 1 капитальное строение административного назначения)
за исключением лота № 3 (инв. № 600/D-84156), лота № 12 (инв. № 600/D-70974) и лота № 11 (инв. № 600/D-97598),

и порядке проведения электронных торгов, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, а также сведения о начальной и минимальной цене указаны в ранее опубликованном извещении о проведении публичных электронных торгов (аукциона) в газете «Звязда» № 252 от 28.12.2024 (300982), стр. 14, а также на сайте ЭТП iintorgi.by

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

УНП 291442411

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(Организатор аукциона)
по поручению **Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества**
(Продавец)
проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА № 66
с инв. № 620/С-44609 общей площадью 696,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622250100010005548
(договор аренды земельного участка по 08.11.2121)
площадью 0,2393 га
по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Дзержинск, пер. Коммунистический, д. 18.

Участок расположен в водоохранной зоне реки Нетечка (площадь 0,2393 га), а также в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт (площадь 0,0028 га).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 202 601,56** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **20 260,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 18 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 16.12.2023.

Аукцион состоится **08.04.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.04.2023** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: (801716) 6-49-33; (8029) 578-35-46.

УНП 600037767



УТВЕРЖДЕНО
Решением управляющей организации
ООО «Оперативный Менеджмент»
Общества с ограниченной ответственностью
«Глера Сигма»
(Приказ № 2 от 26.02.2024)

Изменение в ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ облигаций шестого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «Глера Сигма»

Внести следующее изменение в Проспект эмиссии облигаций шестого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «Глера Сигма» (ООО «Глера Сигма») (далее – Эмитент), утвержденный Решением управляющей организации ООО «Оперативный Менеджмент» общества с ограниченной ответственностью «Глера Сигма» (приказ № 9 от 24.10.2017 г.) (далее – Проспект эмиссии):

1. В пункте 2.7. Проспекта эмиссии облигаций шестого выпуска **«2.7. Способ обеспечения исполнения обязательств Эмитента по облигациям. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям»** адрес объекта недвижимости предмета залога «Благоустройство и инженерные сети (составные части и принадлежности: благоустройство и инженерные сети, сооружение благоустройства и озеленения, бетонная площадка, тротуары, проезды, щебеночно-гравийное покрытие, сеть водопровода, сеть канализации бытовой, сеть ливневой канализации, сеть газоснабжения, сеть электроснабжения, сеть наружного освещения, сеть телефонизации), назначение – сооружение неустановленного назначения» с инвентарным номером 110/С-109048 изменить и изложить в следующей редакции «Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, 102, благоустройство и инженерные сети».

Остальные пункты Проспекта эмиссии остаются без изменений.

От Эмитента:
Директор управляющей организации ООО «Оперативный Менеджмент» _____ В.П. Ложечник

Директор ООО «Эккаунт Проф» _____ К.С. Шахрай

От оценщика:
Заместитель генерального директора РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» _____ Д.И. Корсунский

УНП 291044744



УТВЕРЖДЕНО
Решением управляющей организации
ООО «Оперативный менеджмент»
Общества с ограниченной ответственностью
«Глера Кси»
(Приказ № 2 от 26.02 2024)

Изменение в ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ облигаций Общества с ограниченной ответственностью «Глера Кси» пятого выпуска

Внести следующее изменение в Проспект эмиссии облигаций пятого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «Глера Кси» (ООО «Глера Кси») (далее – Эмитент), утвержденный Решением управляющей организации ООО «Оперативный менеджмент» общества с ограниченной ответственностью «Глера Кси» (приказ № 6 от 18.07.2017) (далее – Проспект эмиссии):

1. В пункте 2.7. Проспекта эмиссии облигаций пятого выпуска **«2.7. Способ обеспечения исполнения обязательств Эмитента по облигациям. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям»** адрес объекта недвижимости предмета залога «Благоустройство и инженерные сети (составные части и принадлежности: благоустройство и инженерные сети, сооружение благоустройства и озеленения, бетонная площадка, тротуары, проезды, щебеночно-гравийное покрытие, сеть водопровода, сеть канализации бытовой, сеть ливневой канализации, сеть газоснабжения, сеть электроснабжения, сеть наружного освещения, сеть телефонизации), назначение – сооружение неустановленного назначения» с инвентарным номером 110/С-109048 изменить и изложить в следующей редакции «Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, 102, благоустройство и инженерные сети».

Остальные пункты Проспекта эмиссии остаются без изменений.

От Эмитента:
Директор управляющей организации ООО «Оперативный Менеджмент» _____ В.П. Ложечник

Директор ООО «Эккаунт Проф» _____ К.С. Шахрай

От оценщика:
Заместитель генерального директора РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» _____ Д.И. Корсунский

УНП 291044785

Клімат

У свеце стала больш пажараў, ураганаў і паводак

А ў нашай краіне пацяпленне заўважней зімой

Як вядома, у канцы сакавіка метэаролагі ўсёй планеты адзначаюць сваё прафесійнае свята — Сусветны дзень метэаралогіі. Дарэчы, першыя інструментальныя назіранні на тэрыторыі Беларусі адносяцца да пачатку першай паловы XIX стагоддзя.

У Магілёве такія назіранні былі арганізаваны з 1808 года, у Віцебску — з 1810 года, а ў Мінску — з 1846 года. А Сусветная метэаралагічная арганізацыя (далей — СМА) была заснавана ў 1873 годзе і з'яўляецца спецыялізаванай установай ААН па пытаннях стану і паводзін атмасферы Зямлі, яе ўзаемадзеяння з сушай і акіянамі, надвор'я і клімату, якія яна стварае, і канчатковага размеркавання водных рэсурсаў. Беларусь з'яўляецца членам СМА з 1948 года

Рэальная пагроза цывілізацыі

Сусветны дзень метэаралогіі штогод праходзіць пад пэўным дэвізам. Традыцыйна ўвага аддаецца якой-небудзь канкрэтнай і актуальнай на дадзены момант праблеме. Тэма Сусветнага метэаралагічнага дня ў 2024 годзе — «На пярэднім краі барацьбы са змяненнем клімату». Гэты дэвіз нагадвае нам, што змяненне клімату — рэальная і бясспрэчная пагроза для ўсёй нашай цывілізацыі. Наступствы ўжо прыкметныя і будуць катастрафічныя, калі мы не пачнём дзейнічаць непасрэдна цяпер, лічаць спецыялісты.

Як расказала **першы намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана КУЗЬМІЧ**, змяненне клімату — гэта глабальная праблема, якая патрабуе мясцовых рашэнняў. Калі паглядзець на павелічэнне сярэдняй глабальнай тэмпературы на 1,5—2 градусы павярхоўна, то яно падасца нязначнай падзеяй.

Аднак, як паказваюць ацэнкі, прыведзеныя ў дакладах Міжурадавай групы экспертаў па змяненні клімату (МГЭЗК), за гэтымі лічбамі стаяць істотныя негатыўныя рэгіянальныя наступствы. Перш за ўсё, гэта датычыцца павелічэння як сярэдніх значэнняў, так і экстрэмуму тэмпературы паветра. Паводле ацэнак навукоўцаў, уплыў глабальнага змянення клімату на марскія, наземныя і прэснаводныя экасістэмы Зямлі аказаўся шырэй і мае нашмат больш наступстваў.

Змяненне клімату паўплывала на частату экстрэмальных з'яў надвор'я: пажараў, ураганаў, паводак. Па ацэнцы МГЭЗК, пераадоленне парога ў 1,5 градуса ў адносінах да даіндустрыяльнага перыяду пагражае незваротнымі пераўтварэннямі зямных экасістэм, а даступныя цяпер інструменты адаптацыі да гэтых змен апынуцца ўжо бескарыснымі. Таму галоўнай задачай чалавецтва, калі яно імкнецца да стабільнасці, павінна стаць рэзкае і значнае абмежаванне вугляродных выкідаў у атмасферу.

Па даных гідраметэаралагічных назіранняў, у нашай краіне ў сярэднім за дзесяцігоддзе пацяплела на 0,4 градуса. Рост тэмпературы паветра адзначаецца ва ўсе сезоны года, але варта заўважыць, што ў розныя гады выяўляюцца адмоўныя адхіленні тэмпературы паветра, якія затым нівеліруюцца значнымі станоўчымі анамаліямі.

Пры гэтым колькасць ападкаў, што выпадаюць на тэрыторыі краіны, змянілася нязначна, аднак у перыяд пацяплення прыкметна павялічылася нераўнамернасць іх выпадзення як унутры года, так і ў цэлым за асобныя гады. Нераўнамернасць выпадзення ападкаў у Беларусі, і асабліва ў спалучэнні з павышаным тэмпературным рэжымам, прыводзіць да ўзнікнення засушлівых з'яў.

Апошняе дзесяцігоддзе (2014—2023 гады) з сярэдняй тэмпературай 8,1 градуса аказалася цяплей любога з папярэдніх. А сярэдняя тэмпература паветра апошніх пяці гадоў (2019—2023 гады) склала 8,3 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 1,1 градуса. Асабліва вылучаюцца 2019, 2020 і 2023 гады, якія сталі самымі цёплымі за ўсю гісторыю метэаназіранняў (8,8, 9,1 і 8,7 градуса адпаведна).

Глабальная тэндэнцыя

Па словах Святланы Кузьміч, за апошнія тры дзесяцігоддзі назіраецца выразна выяўленая тэндэнцыя пацяплення, асабліва ў зімовы перыяд. Найбольшыя станоўчыя адхіленні сярэдняй месячнай тэмпературы паветра ў параўнанні з папярэднім перыядам адзначаюцца ў студзені, лютым і сакавіку (2,4—2,6 градуса), найменшае адхіленне сярэдняй шматгадовай тэмпературы паветра адзначана ў маі і кастрычніку (0,4—0,6 градуса). Станоўчыя анамаліі тэмпературы ў сакавіку—красавіку спрыяюць ранняму сходу снежнага покрыва і пераходу тэмпературы праз 0 градусаў на два-тры тыдні раней, чым звычайна.

У нашай краіне змяненне клімату прыводзіць не толькі да павелічэння колькасці засушлівых з'яў, але і да павелічэння экстрэмальнасці такіх неспрыяльных з'яў, выкліканых прыроднымі фактарамі, як несвоечасовыя (ранніе і позніе) замаразкі, вельмі моцны вецер, шквалы і смерчы, вельмі моцны дождж, вельмі моцны снег, надзвычайная пажарная небяспека, якія наносяць шкоду эканоміцы краіны і здароўю насельніцтва.

Таму своечасовая палітыка дзяржавы ў дачыненні да зніжэння рызыкі і адаптацыі да неспрыяльных пагодных з'яў іграе ключавую ролю ў барацьбе з наступствамі змены клімату.

Наш эксперт адзначае, што большасць мер, якія дапамагаюць адаптавацца да зменлівых кліматычных умоў, прадугледжаны беларускім заканадаўствам у розных праграмных і галіновых дакументах і рэалізуюцца на практыцы. Пры гэтым вельмі важна адзначыць, што асабліва месца ў зніжэнні рызыкі ўздзеяння змены клімату займае павышэнне ўзроўню інфармаванасці насельніцтва аб наступствах і пагрозах змены клімату, а таксама аб мерах рэагавання на іх.

Ацэнка назіраных змяненняў клімату, зыходзячы з дадзеных маніторынгу, з'яўляецца важным складнікам інфармацыйнай базы пры распрацоўцы кліматычнай палітыкі на нацыянальным і міжнародным узроўнях. Маніторынг змянення клімату — адзін з кірункаў дзейнасці дзяржаўнай гідраметэаралагічнай службы нашай краіны.

Дакладны маніторынг

Варта адзначыць, што ў мэтах павышэння эфектыўнасці выкарыстання метэаралагічных даных у практыцы народнай гаспадаркі і паляпшэння кіраўніцтва метэасеткай рэспублікі 1 ліпеня 1924 года ў Беларусі было створана метэабюро пры Наркамземе. Загадчыкам метэабюро быў прызначаны прафесар, метэаролаг, геафізік Мікалай Мышкін. Таму 1 ліпеня лічыцца датай утварэння гідраметэаралагічнай службы Беларусі. І сёлета работнікі Белгідрамета адзначаюць стагадовы юбілей дзяржаўнай гідраметэаралагічнай службы нашай краіны.

Прафільныя спецыялісты (гідраметэаролагі, эколагі) складаюць каля 70 % штатнай колькасці Белгідрамета, і кожны з кірункаў з'яўляецца ўнікальным для дзяржавы, у краіне няма галіны, дублюючай функцыі Белгідрамета. У перыяд з 2018 да 2020 год гідраметэаралагічная галіна зведала глыбокую мадэрнізацыю. У аснову лягла «Дарожная карта» па павышэнні якасці прагназавання надвор'я на кароткатэрміновую і сярэднетэрміновую перспектыву.

Мерапрыемствы па развіцці гідраметэаралагічнай сеткі фінансаваліся пры падтрымцы кіраўніка дзяржавы. Шэраг аб'ектаў быў уключаны ў пералік будоўляў і аб'ектаў Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы, а таксама фінансаваўся ў рамках Дзяржаўнай праграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў».

Развіццё сеткі прыземных метэаралагічных назіранняў дазволіла праводзіць бесперапынныя назіранні за метэаралагічнымі параметрамі з малой дыскрэтнасцю і палепшыць абслугоўванне спажыўцоў, у тым ліку за кошт арганізацыі назіранняў у раёнах, не ахопленых метэаралагічнымі данымі.

Разам з тым установка аўтаматызаваных метэаралагічных станцый (АМС) не выключае неабходнасці выканання назіранняў з удзелам тэхніка-метэоролага. Так, АМС ажыццяўляюць вымярэнне метэаралагічных параметраў (тэмпература, ціск, вільготнасць, хуткасць і напрамак ветру, колькасць ападкаў), але не дазваляюць вызначаць метэаралагічныя характарыстыкі, якія атрымліваюцца тэхнікам-метэаролагам з дапамогай візуальных назіранняў (форма і выгляд аблокаў, наяўнасць навальніц, галалёдныя з'явы, характарыстыкі глебы і снежнага покрыва, правядзенне снегаздымкі і аграметэаралагічных назіранняў).

Для мэт складання прагнозаў надвор'я, кліматычнага маніторынгу, апісання клімату нашай краіны, вядзення Дзяржаўнага кліматычнага кадастру, разліку будаўнічых нормаў неабходныя не толькі вымераныя параметры, але і назіраныя характарыстыкі надвор'я, якія аўтаматычна не вызначаюцца.

Дзейная сетка радыёлакацыйных назіранняў прадстаўлена сучаснымі доплераўскімі радыёлакатарамі, яна пакрывае ўсю тэрыторыю краіны. Створаныя ў нас сетка сучасных радыёлакацыйных назіранняў і адзінае радыёлакацыйнае поле з расійскімі радыёлакатарамі з'яўляецца асновай інфармацыйна-тэхналагічнай платформы Белгідрамета. Гэтыя аб'яднаныя ў адзінае інфармацыйнае поле даныя радараў Белгідрамета і радараў сумежных краін дазваляюць выяўляць небяспечныя і неспрыяльныя з'явы ўжо на подступах да межаў краіны, што, у сваю чаргу, дазваляе атрымліваць аб'яднаную радыёлакацыйную метэаралагічную інфармацыю. І гэта значна павышае своечасовасць і эфектыўнасць звышкароткатэрміновых папярэджанняў аб небяспечных метэаралагічных з'явах (навальніцы, шквалы, ліўні, град), у тым ліку ў інтарэсах грамадзянскай авіяцыі.

Яшчэ адным кірункам дзейнасці Белгідрамета з'яўляецца метэаралагічнае забеспячэнне палётаў грамадзянскай авіяцыі. Функцыянуе сем авіяцыйных метэаралагічных станцый у аэрапортах краіны.

Белгідрамет праводзіць радыяцыйны маніторынг у рэжыме on-line з дапамогай пяці аўтаматызаваных сістэм кантролю радыяцыйнай абстаноўкі, у складзе якіх 33 аўтаматычныя пункты вымярэнняў, у тым ліку 10 пунктаў у раёне размяшчэння БелАЭС, 23 — у зоне ўплыву Ігналінскай, Ровенскай, Чарнобыльскай і Смаленскай АЭС. Радыяцыйная абстаноўка на тэрыторыі краіны стабільная.

У мінулым годзе ў прамысловую эксплуатацыю была ўведзена рэспубліканская інфармацыйная сістэма аўтаматызаванага маніторынгу навакольнага асяроддзя. Гэта праграмны прадукт, які акумулюе ў сабе даныя з усіх пунктаў назіранняў у частцы стану атмасфернага паветра. Сюды ж паступае інфармацыя з прадпрыемстваў па выкідах забруджвальных рэчываў. Гэта досыць вялікі праект, які пачаўся ў 2021 годзе. Дарэчы, у яго рамках была пашырана сетка маніторынгу. У яе ўключаны гарады паскоранага эканамічнага развіцця. У 2023 годзе ў гарадах Добруш, Маладзечна, Бяроза, Смаргонь былі ўстаноўленыя датчыкі якасці атмасфернага паветра, у 2024 годзе гэта будуць гарады Глыбокае, Асіповічы, Петрыкаў. Частка гэтай інфармацыі будзе даступная любому карыстальніку. Больш пашыраны допуск будзе ў міністэрстваў і ведамстваў для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў.

Варта адзначыць, што айчыннай метэаслужбе давялося перажыць няпростыя часы, мабілізаваць намаганні, знайсці новых партнёраў, напрацаваць новыя механізмы прагназавання. Але ўжо сёння можна сказаць, што цяжкасці засталіся ў мінулым, а цеснае ўзаемадзеянне з расійскімі калегамі ў пытаннях імпартазамішчэння дае станоўчыя вынікі.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Да нас ідзе вясна!

У нядзелю будзе ўжо да 22 градусаў

У апошнія гады так заўсёды: яшчэ ўчора ноччу замаразкі, а ўжо заўтра ў зімовым паліто горача. Дзякуючы цёплым паветраным масам, якія паступаюць з поўдня Еўропы, тэмпературны фон працягне павышацца і будзе ў асноўным на 6—11 градусаў вышэй сярэднегадовых значэнняў. У дзённыя гадзіны па заходняй палове і днём у чацвер месцамі па паўднёвым захадзе краіны дыскамфорту будзе дадаваць моцны парывісты вецер.

У аўторак надвор'е будзе пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па поўначы краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3 — плюс 3 градусы, а ўдзень — 7—13 цяпла.

Без ападкаў чакаецца і ў сераду. У гэты дзень у асноўным па заходняй палове краіны ўзмацненне ветру парывамі 15—18 м/с. Уначы слупкі тэрмометраў пакажуць ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, а днём — 10—16 градусаў вышэй за нуль.

У чацвер прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па паўднёвым захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах узмацненне ветру парывамі 15—18 м/с. Уначы чакаецца ад нуля да плюс 7 градусаў, а ўдзень тэмпература павысіцца да 10—17 градусаў.

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, а ўдзень — ад 10 да 16 градусаў цяпла.

Згодна з папярэднім прагнозам сіноптыкаў, у апошнія выхадныя першага вясновага месяца фон атмасфернага ціску зноў пачне павышацца, аблокі стануць рассейвацца і ападкі спыняцца, што дасць магчымасць сакавіцкаму сонцу лепш прагрэць паветра. У выніку ў дзённыя гадзіны ў паўднёвых раёнах слупкі тэрмометраў наблізяцца да 20-градусных адзнак.

У суботу ноччу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, а днём будзе пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах узгусціцца слабы туман. Уначы тэмпература дасягне 1—8 градусаў вышэй за нуль, а ўдзень — ад плюс 13 градусаў на поўначы да плюс 20 градусаў на поўдні.

А ў нядзелю ў нас наогул прыйдзе майскае надвор'е. У апошні дзень сакавіка будзе выключна цёпла і пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі узгусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы чакаецца на ўзроўні 3—10 градусаў, а днём падымецца да 15—22 цяпла.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 1 (76)

Чым багатыя...

Беларусь за сем гадоў у шэсць разоў скараціла імпарт мінеральнай сыравіны

Пра гэта на нядаўняй нарадзе ў Прэзідэнта далажыў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.

«У цэлым аб'ём вытворчасці горназдабыўной прамысловасці за 2023 год склаў 104,3 працэнта да ўзроўню мінулага года. Назіраецца ўстойлівая дынаміка зніжэння імпарту мінеральнай сыравіны з 6,9 млн т у 2017 годзе да 1150 тыс. т у 2023 годзе», — сказаў кіраўнік ведамства.

Беларусь займае 21-е месца сярод еўрапейскіх краін па аб'ёме сыравіны, другое месца па здабычы торфу ў свеце, трэцяе месца ў свеце па здабычы калійных соляў, 29-е — па здабычы каменнай солі. Усяго ў краіне выяўлена больш як 50 відаў карысных выкапняў.

Міністр прызнаў, што існуючы патэнцыял задзейнічаны далёка не ў поўнай меры. На гэта на нарадзе звяртаў увагу і Прэзідэнт. Ён запатрабаваў наладзіць адзіны кантроль за распрацоўкай радовішчаў: напрыклад, дарожнікам патрэбен пясок, будаўнікоў цікавіць шчэбень, энергетыкаў — торф, але незразумела, хто ацэньвае сітуацыю і вырашае, здабываць ці не спадарожныя карысныя выкапні, калі, напрыклад, базальт ляжыць пад торфам. Таму важна курыруючая роля Мінпрыроды.

І гэтае пытанне ўжо вырашаецца. Мінпрыроды з канца 2022 года надзелена дадатковымі функцыямі па каардынацыі дзейнасці ў сферы здабычы і перапрацоўкі карысных выкапняў, распрацоўкі і ўдасканаленні тэхналогій узбагачэння здабытых рэсурсаў.

Іншая праблема — далёка не ў поўнай меры задзейнічаны існуючыя вытворчыя магутнасці па здабычы айчыннай сыравіны. «Перш за ўсё, гэта ўсё-такі зона адказнасці нетракарыстальнікаў. Сітуацыя часовая. З улікам санкцый прыйшлося мяняць рынкі збыту, лагістычныя ланцужкі. Гэта адбывалася ў 2020—2022 гадах. На сённяшні дзень сітуацыя мяняецца ў лепшы бок. Пачынаюць павялічвацца аб'ёмы здабычы і карысных выкапняў і, адпаведна, вытворчасць прадукцыі», — расказаў журналістам Андрэй Худык.

Акрамя таго, адкрываюцца новыя радовішчы розных карысных выкапняў, ацэньваецца іх патэнцыял для прамысловай распрацоўкі. Адно з найболей важных — гэта радовішча базальту. Базальт выкарыстоўваецца для вытворчасці мінеральнай ваты, гукаізаляцыйных матэрыялаў. Таму ён патрэбны айчыннай будаўнічай галіне, у тым ліку з пункту гледжання імпартазамяшчэння. Яшчэ трэба будзе канчаткова вызначыцца з бізнес-планам і коштам рэалізацыі праекта, а ён немалы. «Па базальтах работа будзе весціся сумесна з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. Перакананы, што мы прыйдзем да правільнага рашэння. Галоўнае — гэта эканоміка. Мы разумеем гэта і ў гэтым напрамку рухаемся», — адзначыў Андрэй Худык.

Паводле яго слоў, разлікі паказваюць, што радовішча эканамічна мэтазгодна распрацоўваць. Ідзе размова аб радовішчы базальтаў і туфаў Навадворскае ў Пінскім раёне.

Міністр таксама расказаў, што выкарыстанне новых тэхналогій узбагачэння дасць магчымасць у 2025 годзе практычна на 100 працэнтаў забяспечыць патрэбнасці вытворчасцяў айчыннымі шкляными пяскамі. У гэтым жа плане вядзецца работа і па глінах.

Супрацоўніцтва

АНДРЭЙ ХУДЫК: «КІТАЙСКІЯ КАМПАНІІ ВЫКАЗАЛІ СВАЮ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ БЕЛАРУСКІМІ ІНВЕСТПРАЕКТАМІ»

Горная прамысловасць адыгрывае фундаментальную ролю ў развіцці нацыянальнай эканомікі, таму інтэнсіўнае асваенне радовішчаў, эфектыўнае і рацыянальнае выкарыстанне нетраў, укараненне перадавых тэхналогій здабычы, перапрацоўкі і пошуку новых карысных выкапняў — задачы дзяржаўнай важнасці. Пры іх вырашэнні вялікае значэнне мае абмен вопытам. На мінулым тыдні адбылася адпаведная анлайн-сустрэча міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэя Худыка з кіраўніцтвам Кітайскай геалагічнай службы Міністэрства прыродных рэсурсаў КНР.



Фота Віктара ДРАЧОВА.

Былі абмеркаваны такія тэмы, як інвестыцыйны клімат Беларусі, падатковыя, фінансавыя, прававыя і іншыя аспекты карыстання нетрамі, кітайскія тэхналогіі пошуку, разведкі і здабычы карысных выкапняў, у тым ліку вуглевадародаў, праблемы і перспектывы нафтагазавай галіны, стварэнне сумеснага геалагічнага цэнтра. Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык падкрэсліў, што вопыт Кітайскай геалагічнай службы ўяўляе для беларускага боку вялікую цікавасць, і запрасіў дырэктара Кітайскай геалагічнай службы з камандай інвестараў наведаць нашу дзяржаву, пагутарыць з яе вядучымі геолагамі і на свае вочы ўбачыць магчымасці для эфектыўнага развіцця двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая.

— Мы ведаем Кітай як высокатэхналагічную краіну з багатай гісторыяй развіцця геалагічнай галіны. Са свайго боку мы таксама гатовы дзяліцца сваім вопытам. Рэспубліка Беларусь мае значны патэнцыял розных карысных выкапняў. Улічваючы яе геаграфічнае размяшчэнне, да нас выгадна прыходзіць не толькі для іх разведкі і здабычы, але і для перапрацоўкі і наступнага экспарту на вялікія рынкі краін Еўразійскага эканамічнага саюза, ЕС і іншыя, — заявіў кіраўнік прыродаахоўнага ведамства.

У сустрэчы, апрача галоўных удзельнікаў, прысутнічалі: з беларускага боку — прадстаўнікі Міністэрства эканомікі, Нацыянальнага банка, Беларуснафты, Нацыянальнай акадэміі навук, Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі; з кітайскага — прадстаўнікі Цэнтра вывучэння нафтагазавых рэсурсаў і Сіанскага цэнтра геалагічнай службы КНР.

Кіраўнік Мінпрыроды паведаміў, што ў ходзе перагавораў таксама былі прэзентаваны беларускія інвестыцыйныя праекты, у тым ліку на радовішчы Навадворскае, дзе плануецца здабываць туфы і базальты. Кітайскія кампаніі выказалі сваю зацікаўленасць апошнімі.

— Нашы кітайскія калегі ўжо шукаюць нам патэнцыяльных інвестараў на тэрыторыі КНР. Ёсць некалькі буйных сусветных кампаній, якія выказалі жаданне прыбыць у Беларусь і на месцы вывучыць гэты інвестпраект. Мы ўпэўнены, што крок за крокам прыйдзем да добрага выніку. Безумоўна, такія сур'ёзныя праекты хутка не ствараюцца, — адзначыў Андрэй Худык.

Базальт выкарыстоўваецца для вытворчасці мінеральнай ваты, гукаізаляцыйных матэрыялаў. Ён патрэбны айчыннай будаўнічай галіне, у тым ліку для імпартазамяшчэння.

Таксама ён паведаміў, што Кітайская геалагічная служба падзялілася цікавай інфармацыяй па геолагаразведцы вуглевадародаў, якую яшчэ трэба будзе вывучыць, і была дасягнута дамоўленасць аб павышэнні кваліфікацыі беларускіх геалагічных кадраў.

— У верасні мінулага года мы дамовіліся аб стварэнні сумеснага геалагічнага цэнтра «Беларусь-Кітай». Сёння кітайскія калегі пацвердзілі свой намер. Галоўны геолаг Кітая паабяцаў у найбліжэйшы час прыбыць з камандай у Беларусь і канкрэтна вырашаць гэта пытанне. Падобны вопыт у Кітая ёсць... Ад гэтага праекта мы спадзяемся атрымаць максімальную карысць, — сказаў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

У верасні 2023 года падчас Еўразійскага форуму па міжнародным супрацоўніцтве ў галіне навук аб Зямлі і інвестыцыях у зялёную горную прамысловасць Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Кітайская геалагічная служба падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні па супрацоўніцтве ў галіне геалогіі.

Кіраўнік прыродаахоўнага ведамства выказаў надзею, што сумесныя праекты ў рамках праграм краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў найбліжэйшы час таксама стануць магчымымі для нашай краіны. Аднак аб тэрмінах стварэння геалагічнага цэнтра казаць пакуль цяжка.

— Найперш трэба разабрацца з арганізацыйнымі пытаннямі: знайсці фінансы, вывучыць навуковы і практычны вопыт кітайскіх калег. Па гэтых кірунках працуем з імі даволі цесна... Спадзяемся стварыць сумесны геалагічны цэнтр на працягу першага паўгоддзя бягучага года, але ўсё можа змяніцца. У любым выпадку мы гатовы чакаць, бо гэты цэнтр — вялікая дапамога Беларусі і нашым геолагам, — падсумаваў Андрэй Худык.

Падводзячы вынікі анлайн-сустрэчы, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выказаў упэўненасць, што праведзенае мерапрыемства будзе садзейнічаць паглыбленню беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў галіне рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, а таксама што яно з'яўляецца пацвярджэннем сапраўднага шчырага сяброўства як паміж краінамі, так і кіраўнікамі Беларусі і Кітая. Ён адзначыў:

— Я перакананы, што сённяшнія прапановы і канкрэтныя паслядоўныя крокі, аб якіх нам удалося дамовіцца, дадуць магчымасць выканаць даручэнне кіраўніка дзяржавы па інтэнсіфікацыі мінеральна-сыравіннай базы ў Беларусі.

Адной з задач, пастаўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца павелічэнне геалагаразведачных работ, бо ўласныя мінеральна-сыравінныя рэсурсы маюць вырашальнае значэнне для стабільнага развіцця эканомікі і з'яўляюцца залогам суверэнітэту, асабліва ў абставінах санкцыйнага прэса.

Александрына ПАРШЫНА.

Далучайцеся!

У «Гадзіну Зямлі» — разам!

Сусветная экалагічная акцыя «Гадзіна Зямлі» традыцыйна пройдзе 30 сакавіка. У гэты дзень з 20.30 да 21.30 у мностве гарадоў, у тым ліку ў нашай краіне, пагаснуць вулічная ілюмінацыя, падсветка помнікаў, гістарычных будынкаў, крам і іншых устаноў. Але адкуль з'явілася гэта мерапрыемства?

«Гадзіна Зямлі» — своеасаблівы заклік аб'яднацца ў барацьбе з экалагічнымі праблемамі, зразумець неабходнасць адказнага стаўлення да навакольнага асяроддзя і прыродных рэсурсаў, унесці свой уклад і дабрабыт планеты. У маштабнай акцыі ўдзельнічае звыш двух мільярдаў чалавек і тысячы прадпрыемстваў з амаль 200 краін. Беларусь далучылася да яе ў 2009 годзе адначасова з Расіяй. Мерапрыемства добраахвотнае, стаць удзельнікам яго можа кожны, неабходна толькі адключыць электрычнасць у доме ці кватэры на адну гадзіну.

Ініцыятарам першай акцыі быў Сусветны фонд дзікай прыроды Аўстраліі. Дваццаць гадоў таму яго прадстаўнікі звярнулі ўвагу на даследаванні навукоўцаў аб зменах клімату. Уявілі наступствы, устрывожыліся і, каб дапамагчы нашаму касмічнага дому, вырашылі прыцягнуць да праблемы як мага больш людзей. Сказаць проста, а зрабіць? Канцэпцыя распрацоўвалася амаль год. Дарэчы, назва акцыі спачатку была «Вялікая пстрычка», але пазней яе змянілі на «Гадзіну Зямлі», каб перанесці акцэнт з эканоміі электраэнергіі на праблемы ўсёй планеты.

Першае мерапрыемства адбылося 31 сакавіка 2007-га ў Сіднеі. Гэта дата лічыцца пунктам адліку выключнай папулярнасці акцыі, бо ўдзел у ёй узялі больш чым 2,2 мільёна чалавек і 2100 арганізацый! У наступным годзе да «Гадзіны Зямлі» далучыліся ўжо 35 краін і звыш 400 гарадоў.

У Беларусі кураторам «Гадзіны Зямлі» з'яўляецца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Прычым мерапрыемства кожны год ладзіцца пад пэўным лозунгам. У 2023-м, напрыклад, было «Захавай прыгажосць!». Сапраўды, на нашай планеце столькі цудаў: смарагдавая зеляніна лясоў, крышталёвая чысціня рэк і азёр, багацце відаў флоры і фаўны...

Далучайцеся да «Гадзіны Зямлі» і іншых экалагічных акцый, спяшайцеся ўнесці свой уклад у агульную справу аховы прыроды. Захаваем яе для нашчадкаў.

Парадак на зямлі

З любоўю да чысціні

Штогод увесну Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ладзіць акцыю па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Сёлета ў рэгіёнах Беларусі яна праходзіць з 1 сакавіка па 8 мая. Асноўныя работы засяроджаны на абразанні сухіх галінак, прыборцы лістоты і смецця. Шмат увагі аддаецца добраўладкаванню тэрыторый агульнага карыстання ў населеных пунктах, а таксама ўчасткаў уздоўж чыгункі і аўтамабільных дарог. У красавіку з надыходам цеплыні запланаваны пасадкі дрэў і хмызняку, будуць закладзены новыя алеі і паркавыя зоны.

Каб актывізаваць работу на месцах, прыродаахоўныя ведамствы праводзяць кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы. На адным з такіх рэйдаў прадстаўнікоў Мінпрыроды па сталіцы і Мінскай вобласці пабывалі і карэспандэнты «Звязды».

Першы пункт маршруту — Партызанскі раён. Нягледзячы на досыць халоднае надвор'е і змрочнае неба, схаванае ў цяжкія хмары, работа кіпіць. Грымяць спецыяльныя машыны, якія «пераможваюць» ветравал і спілаваныя галінкі — тэхналагічная трэска з іх пойдзе як матэрыял для ўгнаення буякоў, добраўпарадкавання клумбаў, іншай гаспадарчай дзейнасці. Рабочыя збіраюць пластыкавыя бутэлькі, падраныя поліэтыленавыя пакеты, абгорткі ад прадуктаў харчавання, нават... старое адзенне — горкія сведкі несумленных паводзін насельнікаў раёна і жалезны аргумент, чаму необходна прафілактычная работа з грамадзянамі.

Усяго ў работах па вызваленні каркасных вуліц, паркаў і сквераў ад смецця, леташняй лістоты і пяску задзейнічана каля 45 чалавек. Вынікі даволі станоўчыя — ачышчана ўжо 40 % тэрыторыі.

— Застаецца навесці парадак на 820 га, у якія ўваходзяць гарадскія тэрыторыі, а таксама палігон Калодзішчы. Да канца месячніка ці нават раней мы завершым работы і возьмемся за азеляненне. Будзе пасаджана 250 дрэў, ёсць свае планы і ў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, — падкрэслівае **дырэктар Зелянбуда Партызанскага раёна Сяргей ГЕРАСІМЧЫК**.

У Заводскім раёне рамантуюць пасля зімовай эксплуатацыі вулічна-дарожную сетку, збіраюць смецце, камунальныя адходы і лістоту, са старой пажоўклай травы выцягваюць пасечаны раней сухі хмызняк. Парадак наводзяць усе суб'екты гаспадарання, але ёсць і праблемныя зоны, дзе прыборка патрабуецца часцей звычайнага. Больш за ўсё іх у прыватным сектары.

— У нас у раёне ёсць ручай Безыменны, па абаіх баках якога стаяць прыватныя дамы. Жыхары чысцяць свае агароды, а бруд, бытавыя адходы, будаўнічае смецце выкідваюць у зялёную зону. Выцягваюць нават старыя канапы, зламаныя крэслы і іншыя прадметы мэблі, — дзеліцца **майстар участка па добраўпарадкаванні Зелянбуда Заводскага раёна Таццяна ТКАЧОВА**.

І ўсё ж прафілактыка дае добрыя вынікі, таму ў Мінпрыроды ёсць надзея на вырашэнне пытання стыхійных сметнікаў. Людзі прыслухоўваюцца да просьбаў, ведаюць пра наступствы і ў цэлым паступова пачынаюць усведамляць сваю адказнасць за стан навакольнага асяроддзя. Сітуацыя паляпшаецца, ёсць станоўчая дынаміка, але прафілактычную работу неабходна працягваць.

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення каардынацыі кантрольнай дзейнасці Мінпрыроды Уладзіміра ЛЕМЯНТОВІЧА**, калі чалавек упершыню парушыў прыродаахоўнае заканадаўства, справа хутчэй за ўсё скончыцца прафілактычнай размовай. Так, у 2023 годзе было вызвалена ад адміністрацыйнай адказнасці звыш дзевяці тысяч асоб. Пры паўторным парушэнні ўжо прымаюцца адпаведныя меры і накладваецца штраф. У прыватнасці, летась да адказнасці было прыцягнута больш чым тры тысячы грамадзян, а шкода навакольнаму асяроддзю склала звыш Br10 млн.

— Наступны этап добраўпарадкавання — фарбаванне малых архітэктурных формаў, азеляненне і іншыя віды адпаведных работ. Наша задача — зрабіць раён яшчэ больш прыгожым і чыстым, — адзначае **начальнік аддзела аператыўнага кантролю па Заводскім, Кастрычніцкім і Савецкім раёнах Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ігар КАПАЧ**.

Рэспубліканскі план па навядзенні парадку на зямлі ўключае каля 110 мерапрыемстваў, але ў перыяд акцыі ў кожным раёне Мінска будуць свае планы неабходных работ на тэрыторыях агульнага карыстання, у зонах масавага адпачынку, на чыгунцы і ў іншых месцах.

За навядзеннем парадку на зямлі сочаць і ў Мінскай вобласці. Напрыклад, у Дзяржынску кіраўніцтва горада арганізуе работу з прамысловымі прадпрыемствамі і суб'ектамі гаспадарання, за якімі замацаваны пэўныя ўчасткі горада. Адказныя сваімі сіламі праводзяць прыборку арганічных адходаў (лістоты, галінак), бытавога смецця. Некаторымі тэрыторыямі агульнага карыстання займаюцца камунальныя службы.

— Акрамя гэтага, мы ўладкоўваем розныя зоны адпачынку для жыхароў. Зараз заканчваем добраўпарадкаванне сквера каля райвыканкама, дзе будуць размешчаны пляцоўкі для гульняў і заняткаў спортам, лаўкі і велапаркоўка. Вызначана таксама месца пад кавярню. Для падтрымання парадку прадугледжана сістэма відэаназірання і асвятлення. На гэтай тэрыторыі плануем завяршыць асноўныя віды работ ужо ў красавіку. Засталося толькі азеляненне — высадзім

больш за тры тысячы кветак. Такія лакацыі будуць стварацца і потым, у тым ліку і ў горадзе-спадарожніку Фаніпалі, — заяўляе **намеснік старшыні Дзяржынскага райвыканкама Дзяніс ПРАКОПЧЫК**.

Наогул Дзяржынск і Фаніпаль досыць зялёныя гарады. Штогод тут, па словах **начальніка Дзяржынскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Дзмітрыя ЦЯРЭШКІ**, у сярэднім высаджваецца каля 5-7 тысяч дрэў, а таксама каля 10 тысяч кустоў. Сёлета на азеляненне плануецца патраціць каля 900 тысяч рублёў.

— Цяпер збіраецца інфармацыя, колькі насаджэнняў патрэбна Дзяржынску і іншым населеным пунктам раёна. Потым закупім маладыя дрэўцы і будзем высаджваць у рамках месячніка ў адпаведнасці з горадабудаўнічай дакументацыяй. Да працы будуць прыцягвацца грамадзяне і юрыдычныя асобы, — распавядае начальнік раённай інспекцыі. — Дарэчы, у апошнія гады насельніцтва актыўна бярэ ўдзел у азеляненні і праяўляе ініцыятыву. Так, мінулай восенню многія тэлефанавалі нам з пытаннямі, дзе можна ўзяць саджанцы, дзе пасадзіць дрэвы. Асабліва гэта датычыцца людзей з сельскай мясцовасці. А некаторыя юрыдычныя асобы за ўласныя сродкі купляюць саджанцы і робяць клумбы каля сваіх тэрыторый.

Далейшы план адміністрацыі Дзяржынскага раёна — уладкаванне яшчэ адной зялёнай зоны. На беразе ракі Няцечка будзе пабудаваны спартыўны комплекс з кортамі, рознымі спартыўнымі пляцоўкамі. Дзмітрый Цярэшка дадае:

— У Фаніпалі прадугледжана пасадка гарадскога парка ўзамен старога, які быў знішчаны моцнымі вятрамі ў 2020—2022 гадах. Ужо распрацаваны генеральны праект. Плануецца больш за 1 га насаджэнняў з якасных культур, каб парк праз некалькі гадоў меў прэзентабельны выгляд. Работы хутчэй за ўсё будуць завершаны на працягу 2024—2025 гадоў, паколькі аб'ёмы вялікія. Але частка дрэў ужо ёсць.

Дасталося ад непагадзі і прыдарожным палосам Дзяржынскага раёна. Так, наступствы ўраганаў актыўна ліквідуюцца на адрэзку маршруту Фаніпаль — Пераможнае. Тут равуць бензапілы, вішчаць трэскадрабільныя машыны — паветра поўніцца прыемным пахам свежаспілаванай драўніны. Прыборкай паваленых дрэў і зламаных сукоў займаецца каманда ДРБУ № 210 Мінскаблдарбуда. Яе **начальнік Мікалай КІШКУРНА** тлумачыць:

— Паколькі аб'ём работ вельмі вялікі, прыцягваем спецыялістаў з МНС, нават вайскоўцаў. Ад нашай арганізацыі сёння працуе каля 20 чалавек. Яны дробняць галінкі і драўніну, вывозяць іх на вытворчую базу. Так, на сёння мы нарыхтавалі 128 кубаметраў драўніны, якая будзе выкарыстана для абагрэву рамонтных майстэрняў і нашых вытворчых магутнасцяў. Спадзяемся справіцца з усімі наступствамі непагадзі да канца сакавіка.

Александрына ПАРШЫНА.
Фота аўтара і Кацярыны УРБАН.

ПАД АХОВАЙ

Не чапай прадвеснікаў вясны

Вясна прыйшла! На вільготнай зямлі дзе-нідзе з'явілася цуда цудаў — эфемероіды, або першацветы. Жоўтыя, белыя, фіялетавыя, блакітныя кветкі так і вабяць зрабіць букет, але, якім бы згаладалым па яркіх красках пасля зімы ні быў, — не кранай!

Першацветы квітнеюць звычайна некалькі тыдняў у красавіку, аднак, калі надвор'е досыць цёплае, могуць і ў сярэдзіне сакавіка. За гэты час расліна назапашвае рэчы, неабходныя для фарміравання і рассявання насення. Збор кветак у гэты перыяд прыводзіць да скарачэння іх арэалу распаўсюджвання. Да таго ж сарваныя першацветы хутка вянуць, таму любавацца імі лепш у прыродным асяроддзі.

Мноства эфемероідаў з'яўляюцца чырванакніжнымі: кураслеп лясны, пярэсна еўрапейская, сон лугавы, сон раскрыты, раўнаплоднік пылюшнікавы, цыбуля мядзведжая (чарамша) і іншыя. Даведацца, якія першацветы рэдкія або знаходзяцца на мяжы знікнення, можна на афіцыйным сайце Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя **https://www.minpriroda.gov.by/uploads/files/Pervotsvety-krasnoknizhniki-itog.pdf**).

Згодна з артыкулам 24 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2003 года № 205-З «Аб раслінным свеце», самавольныя канфіскацыя і перасадка дзікарослых раслін, якія адносяцца да відаў, уключаных у Чырвоную кнігу Беларусі, з асяроддзя іх росту, незаконны абарот, а таксама іх выдаленне і іншыя дзеянні, якія могуць прывесці да іх гібелі, скарачэння колькасці або парушэння асяроддзя іх росту, забараняюцца. Вінаватыя асобы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці.

Часам можна пачуць такія словы: «Што такога, калі я набуду букет з першацветаў? Я ж сам іх не рваў». Не рваў, але ў пэўным сэнсе адказнасць за змяншэнне іх відаў усё роўна ляжыць на такім чалавеку, бо так ён заахвочвае браканьераў.

Інга ВІНТЭР.
Фота Таццяны МАІСЕЕВАЙ.

ИЗМЕНЕНИЯ № 1 В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского», опубликованную в газете «Звязда» № 20 (30154) от 30.01.2024 г.

Сведения о застройщике

Застройщик: общество с ограниченной ответственностью «ТАПАС» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.07.2001 г. за № 101484246.

Юридический адрес и местонахождение предприятия: 220114, г. Минск, пр-т Независимости, д. 173, пом. 215-4, тел./факс: (017) 302 84 10/15.

Офис продаж: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж, офис 210, тел.: +375 (29) 340 05 40, +375 (33) 340 05 40.

Режим работы офиса продаж: понедельник-четверг с 9.00 до 18.30, пятница – с 9.00 до 18.00, без обеда.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации, с указанием информации о фактических сроках строительства данных объектов:

- жилой дом № 123 по пр-ту Дзержинского в г. Минске – 64 мес.;
- жилой дом № 45 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 23 мес.;
- жилой дом № 47 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 27 мес.;
- жилой дом № 49 по ул. Ржавецкой в г. Минске – 25 мес.;
- одноквартирные жилые дома №№ 4, 6, 6А, 8, 8А, 10, 10А, 12, 12А, 14, 14А, 16, 16А по ул. Ратомской – 19 мес.;
- жилые дома №№ 18, 20 по ул. Ратомской – 23 мес.

Информация об объекте строительства

Цель строительства – строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр. Дзержинского».

Срок начала строительства объекта – 09 августа 2018 года. Нормативная продолжительность строительства – 24 месяца. Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода его в эксплуатацию – 4 квартал 2024 года.

Строительство осуществляется на основании:

- решений Минского городского исполнительного комитета от 07.06.2018 г. № 1866 и от 30.09.2021 г. № 2926;
- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу (заключения РУП «Главгосстройэкспертиза» № 76-15/18 от 22.03.2018 г., № 164-15/19 от 24.05.2019 г., № 71-15/22 от 24.03.2022 г., № 71-15/22-Д1 от 31.03.2022 г., № 71-15/22-Д2 от 15.06.2022 г., № 146-15/23 от 06.04.2023 г.;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и прав на него № 500/249-13446 от 17.05.2023 г.;
- договора строительного подряда на строительство объекта № 1М-ГП от 30.03.2022 г., заключенного с ООО «ТАПАС ПЛЮС»;
- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданного Инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 09.08.2018 г. № 2-203Ж-031/18.

Сведения об объекте строительства

Земельный участок для строительства объекта расположен в Московском районе г. Минска в границах: с северо-запада – улицей Розы Люксембург и ранее сложившейся жилой застройкой средней этажности, с юго-востока – проспектом Дзержинского с расположенным вдоль проспекта отелем «Ренессанс Минск», а также бизнес-центром. Земельный участок общей площадью 0,4945 га предоставлен застройщику во временное пользование для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр. Дзержинского».

Объект представляет собой многоквартирный жилой дом комфортной категории проживания со встроенно-пристроенными помещениями и гаражом-стоянкой закрытого типа. Жилой дом совместно со встроенными помещениями и гаражом-стоянкой образует единый 23-этажный комплекс, с техническим чердаком и цокольным надземным этажом. Высота здания – 74,2 м. Здание состоит из разноэтажных объемов, в которых размещены различные по функциональным группам помещения:

- основной (высотный) 23-этажный объем в осях 1-7, А-Ж с размерами в плане по крайним осям 21,25 х 22,7 м. В нем размещена жилая часть и медицинский центр;
- к основному объему пристроена неотапливаемая гараж-стоянка закрытого типа, решенная в два уровня с раздельными въездами-выездами. В пристроенной части также размещены офисные помещения и расчетно-кассовый центр. Объем имеет сложную в плане форму габаритами в крайних осях 1/1-16/1 и А/1-С/1 68,7х47,6 м;
- смежно с гаражом-стоянкой размещены: трансформаторная подстанция и повысительная насосная станция;
- кровля пристроенной части – эксплуатируемая, плоская совмещенная, с внутренним водостоком, решена в несколько уровней с переходными лестницами;
- кровля высотной части – плоская совмещенная, неэксплуатируемая, с внутренним водостоком.

Конструктивная схема здания **жилого дома** — монолитный железобетонный рамно-связевый каркас. Наружные ограждающие стеновые конструкции — вентфасад из алюминиевых кассет на подсистеме стальных профилей с остеклением и заполнением глухих участков минераловатными плитами, участки наружных стен – монолитные железобетонные. Внутренние стены – монолитные железобетонные. Перегородки — из блоков керамзитобетона толщиной 100 мм. Оконные проемы, остекление лоджий — структурное остекление с заполнением стеклопакетами. На лоджиях предусмотрено не менее 50 % открывающихся створок. Открывающиеся створки окон оборудованы детскими замками безопасности. Заполнение глухой подоконной части остекления принято высотой не менее 1,1 м из многослойного безопасного стекла. Двери из алюминиевого профиля, стальные.

Принятая высота этажей в отметках чистого пола:

- цокольный этаж – (переменная) 2,66… 4,95 м;
- 1-й этаж – (переменная) 2,4… 4,1 м;
- жилые этажи 2–19 – 3,15 м;
- жилые этажи 20–23 – 3,6 м;
- технический чердак – 2,35; 3,7 м (в чистоте).

Всего квартир в доме – 96, в том числе: 1-комнатных – 41, 2-комнатных – 42, 3-комнатных – 13.

В здании запроектированы 3 лифта грузоподъемностью 1000 кг.

Гараж-стоянка запроектирована в два уровня закрытого типа на 111 машиномест. Въезды (выезды) организованы по прямолинейным двухпутным рампам. На каждом уровне предусмотрено устройство зарядных станций для электромобилей и машиномест для транспорта маломобильных лиц. При постановке автомобилей перпендикулярно ограждающим конструкциям и вдоль рамп предусмотрено устройство колесоотбойников. Полы запроектированы с уклоном к водоотводящим устройствам. На въездах предусмотрена установка ворот.

Наружная отделка:

- стены – вентфасад с облицовкой алюминиевыми кассетами; витражное остекление; сэндвич-панели; легкая штукатурная система; ламели.

Внутренняя отделка помещений общего пользования: стены – декоративная штукатурка, потолки – покраска, подвесные потолки; покрытие пола – керамическая плитка.

В квартирах и встроенных помещениях предусмотрена подготовка под отделку (полы со звукоизоляцией и цементно-песчаной стяжкой, стены — улучшенная штукатурка; потолки – заделка швов, выравнивание поверхности).

Объект оборудуется всеми необходимыми инженерными системами и оборудованием согласно проектной документации: предусматриваются отдельные системы отопления для жилых помещений и для встроенных помещений. В жилом доме предусматриваются отдельные ветки систем отопления для мест общего пользования, лестничных клеток, технических помещений на отм. -2,680. В качестве отопительных приборов предусматриваются: низкопольные конвекторы с нижним подключением для жилых помещений, стальные панельные радиаторы для остальных помещений. Для жилых помещений проектом предусматривается приточно-вытяжная вентиляция с естественным и механическим побуждением движения воздуха. В жилом доме запроектированы следующие системы внутреннего водоснабжения и канализации: отдельные зонные системы внутреннего хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения (1 зона – 1–6 этажи; 2 зона – 7–23 этажи), отдельная система противопожарного водопровода – (система — АПТ), отдельные системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения встроенных помещений; системы бытовой канализации и внутренних водостоков; дренажная система (от кондиционеров).

В жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым преимущество должно отдаваться гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, ИТП, электрощитовая, коридоры общего пользования, лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, кровля, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, помещение товарищества собственников, элементы озеленения и благоустройства дворовой и прилегающей к жилому дому территории.

Застройщик передает общее имущество совместного домовладения после приемки в эксплуатацию представителю товарищества собственников, а если на момент приемки в эксплуатацию объекта товарищество собственников не будет создано – лицу, определяемому общим собранием дольщиков или уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Комплексное благоустройство территории включает в себя устройство проездов и парковок, пешеходных тротуаров и дорожек, устройство детских и спортивных площадок, оборудование территории малыми архитектурными формами, устройство хозяйственной площадки для ТКО, озеленение территории.

Финансирование элементов благоустройства территории производится участниками строительства жилого дома.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предлагаются:

1) 2 квартиры, расположенные на 2-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 92,73 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4900 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 84,44 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4900 белорусских рублей;

2) 4 квартиры, расположенные на 3-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 92,73 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 4900 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 54,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5500 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 86,08 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5000 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 58,69 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5500 белорусских рублей;

3) 1 квартира, расположенная на 4-м этаже жилого дома:
- однокомнатная квартира общей площадью 60,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5600 белорусских рублей;

4) 1 квартира, расположенная на 5-м этаже жилого дома:
- двухкомнатная квартира общей площадью 96,42 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5000 белорусских рублей;

5) 2 квартиры, расположенные на 6-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 96,42 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5100 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 56,73 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5900 белорусских рублей;

6) 1 квартира, расположенная на 12-м этаже жилого дома:
- однокомнатная квартира общей площадью 61,05 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6300 белорусских рублей;

7) 1 квартира, расположенная на 16-м этаже жилого дома:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5500 белорусских рублей;

8) 1 квартира, расположенная на 17-м этаже жилого дома:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5600 белорусских рублей;

9) 1 квартира, расположенная на 18-м этаже жилого дома:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5700 белорусских рублей;

10) 2 квартиры, расположенные на 19-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 5800 белорусских рублей;
- трёхкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6000 белорусских рублей;

11) 3 квартиры, расположенные на 20-м этаже жилого дома, в том числе:
- трёхкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6150 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 88,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6300 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,54 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6800 белорусских рублей;

12) 3 квартиры, расположенные на 21-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6600 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 206,38 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 6900 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,53 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7000 белорусских рублей;

13) 3 квартиры, расположенные на 22-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7900 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 206,38 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7900 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,53 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 7900 белорусских рублей;

14) 4 квартиры, расположенные на 23-м этаже жилого дома, в том числе:
- двухкомнатная квартира общей площадью 95,60 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 8400 белорусских рублей;
- трехкомнатная квартира общей площадью 116,72 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 8400 белорусских рублей;
- двухкомнатная квартира общей площадью 88,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 8400 белорусских рублей;
- однокомнатная квартира общей площадью 60,56 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартиры составляет 8400 белорусских рублей;

15) 20 машино-мест в гараж-стоянке жилого дома. Стоимость строительства машино-места составляет 45 000 белорусских рублей;

16) 10 машино-мест в гараж-стоянке жилого дома с электрической зарядной станцией. Стоимость строительства машино-места составляет 90 000 белорусских рублей;

17) 3 административных помещения, в том числе:
- расчетно-кассовый центр общей площадью 121,53 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади расчетно-кассового центра составляет 7900 белорусских рублей;
- медицинский центр общей площадью 311,2 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади расчетно-кассового центра составляет 7200 белорусских рублей;
- помещение офисов общей площадью 312,2 кв. м. Стоимость строительства 1 кв. м общей площади помещения офисов составляет 6500 белорусских рублей.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа, и условий оплаты строящегося жилого помещения, и иных факторов, влияющих на стоимость.

По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

Условия оплаты

Оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно (в течение 5 (пяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме) либо в установленный договором период по графику платежей.

Для подачи заявления и заключения договора необходимы:

- для физического лица: личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор, с паспортом или его представителя. Документы представителя – паспорт, доверенность, оформленная в установленном законодательством порядке, копия паспорта, копия доверенности;
- для юридического лица: личное присутствие руководителя юридического лица, с которым будет заключаться договор, или его представителя. Документы – копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица, копия Устава юридического лица, документ, подтверждающий полномочия на представление интересов.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 02.04.2024 г. по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж, ООО «Агентство недвижимости «Мегаполис». Время работы: понедельник-четверг с 9.00 до 18.30 без обеда, пятница с 9.00 до 18.00 без обеда. Суббота, воскресенье – выходные.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, а также о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 173, 2-й этаж, ООО «Агентство недвижимости «Мегаполис». Тел. +375 29 3400540.

ОАО «НАФТАН»

реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

Пометка на конверте	Наименование	Инв. №	Начальная цена без НДС, руб. РБ	Начальная цена с НДС, руб. РБ
Реализация неликвидов, Нафтан 25.04.2024 г.	Цистерна съемная 2 м³	06273326	8381,60	10057,92
	Цистерна съемная 2 м³	06273327	8381,60	10057,92
	Резательная машина	195111	1588,00	1905,60
	Резательная машина	195112	1588,00	1905,60
	Резательная машина МРБ-100	195349	6408,80	7690,56
	Экструзионная линия «Арсенал-1600Е»	196797	105885,60	127062,72
	Установка рукавной пленки УРП-1500-3	192490	31649,60	37979,52
	Шкаф упр. эл./приводом ШУЭ1-2,2 IP54 2,2 кВт	194261	692,00	830,40
	Шкаф упр. эл./приводом ШУЭ1-2,2 IP54 2,2 кВт	197262	692,00	830,40
	Шкаф упр. эл./приводом ШУЭ1-75 IP54 75 кВт	197268	5012,80	6015,36
Реализация емкостей, 25.04.2024 г.	Емкость конденсата V – 200 м³	143206	41 700,00	50 040,00
	Емкость конденсата V – 200 м³	143207	41 700,00	50 040,00

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: **211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30** по местному времени **25 апреля 2024 года** с пометками на конверте, приведенными в таблице, либо в электронной форме на e-mail: **tender.box@naftan.by** с вышеназванными пометками.

Извещения на проведение конкурса размещены на сайте **www.naftan.by.** Контактные телефоны: **8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42.**

УНП 300042199

Крылы Царэўны-Лебедзя, Чмель на дроце і шмат энтузіязму

Як у Акадэміі музыкі рыхтуюць дыпломны спектакль

Чароўная Вавёрка ў школьнай форме — бо толькі з заняткаў — скача праз імправізаваную браму замка з драўляных палак да Цара Салтана ў джынсах, які ўладкаваўся на яшчэ не да канца пазалочаным троне. «Арэшкі» са скамечанай паперы з кошыка Вавёркі лятуць у Цара і яго прыдворных дам, якія накінулі доўгія спадніцы паўзверх джынсаў. Гучыць вядомая мелодыя «Во саду ли, в огороде...», а перад намі на парэнчах ложы пухнацяцца лебядзіныя крылы — іх зрабіла з падручных матэрыялаў сама Царэўна-Лебедзь, якую за кулісамі завуць Алёна... Усё весела, гарэзна, душэўна... Ідзе рэпетыцыя дыпломнага спектакля студэнтаў Акадэміі музыкі — оперы «Казка пра цара Салтана» Рымскага-Корсакава — пад кіраўніцтвам загадчыцы кафедры опернай падрыхтоўкі і харэаграфіі, вядомай спявачкі Ірыны КРЫКУНОВАЙ.

Вы ніколі не задумваліся, адкуль бяруцца зоркі опернай сцэны, якіх мы бачым у промнях сафітаў і ў выкшталцоных сцэнічных касцюмах? Як яны пачыналі, колькі працы за кожным віртуозным выкананнем, у тым ліку — вось у такіх студэнцкіх рэпетыцыях, калі і касцюмы, і дэкарацыі трэба рабіць самім?

Ёсць магчымасць паназіраць...

Вось тая самая Алёна, Царэўна-Лебедзь, прыладжвае драцяныя вусікі Чмялю. Ну, памятаеце знакамітую музыку «Палёт чмяля», якая суправаджае абгорнутага ў яркую жамяру цара Гвідона? Чмель яркі, пухнаты і зроблены з мачалак...

Тым не менеш самадзейнасці тут няма — наадварот. Прафесійныя цудоўныя галасы, прафесійная рэжысура, а ўжо якая творчая аддача: студэнты, дакладней ужо гатовыя артысты оперы, выкладваюцца напоўніцу... І, зразумела, крэатывяць пры падтрымцы свайго рэжысёра, якая і з Вавёркай паскача, і дзіду пакажа, як трымаць, і сама падпяе. Без Ірыны Генадзьеўны, зразумела, не было б такой узнёслай творчай атмасферы і ўсялякіх незвычайных прыдумак. Вось баба Бабарыха, галоўная злыдня сюжэта, назіраючы за тым, як царыца Мілітрыса гойдае на руках нованароджанае дзіця, гэтак жа гойдае... стылізаваную ляльку вуду, потым кладзе яе на зямлю, дастае з валасоў шпільку і... А вось царыцу Мілітрысу з маленькім царэвічам садзяць у бочку, якая пакуль што ўмоўная, толькі контур яе — з драўляных планак. Але маленькі Гвідон — сапраўды чароўны кучаравенькі хлопчык гадоў сямі, прычым у жыцці ён — сынок бабы Бабарыхі, харызматычнай вясёлай Ксеніі Малахвейчук. Да апошніх курсаў многія студэнты ствараюць сем'і, таму няма праблем, дзе знайсці дзяцей для паказу. Мне расказалі, што ў спектаклі з'явіцца яшчэ адзін Гвідон, дакладней Гвідончык — яшчэ меншы дзіцёнак, таксама сынок кагосьці са студэнтаў: трэба ж паказаць, як у бочцы царэвіч расце!

Як расказвае нам Царэўна-Лебедзь Алёна Якавук, узроставага цэнзу для вакалістаў няма... Оперны голас — гэта рэдкі дар, ён можа раскрыцца ў розны час, чалавек можа не мець музычнай падрыхтоўкі, але яго возьмуць вучыцца. Таму сярод знакамітых спевакоў

столькі розных цікавых лёсаў. Дарэчы, прачытала, што Ірына Крыкунова, сённяшняя прыма оперных сцэн, скончыла ў свой час тэхнічны ўніверсітэт...

Пакуль у адной частцы сцэны адбываецца рэпетыцыя, у другой, каля куліс, студэнты працягваюць працаваць над дэкарацыямі. Кажуць, што і па начах працуюць. А што ж, такі спектакль — раз у жыцці, не проста прэм'ера, а дзяржэкзамен! А для гледача магчымасць паглядзець на будучыню беларускай музыкі, бо сярод сённяшніх выпускнікоў акадэміі абавязкова ёсць новыя зоркі, і меламан калісьці з гонарам скажа: «А я яго бачыў яшчэ ў студэнцкім спектаклі!» Мы, вядома, называем іх усіх студэнтамі, але, напрыклад, Ксенія Малахвейчук — гэта яшчэ і актрыса, якая здымалася ў кіно і іграла ў мюзіклах, недарма за ёй на сцэне хочацца сачыць. Васіль Ліпскі, выканаўца партыі Гвідона, удзельнічае ў канцэртах Белдзяржфілармоніі, Антон Карчэўскі — саліст Нацыянальнага акадэмічнага аркестра імя М. Фінберга, Алёну Якавук ведаюць па камерным хоры «Concertino», у кожнага шмат перамог у вакальных конкурсах.



— Куды, Цар, ідзеш? Пачакай, пакуль трон вынесуць! — між тым каментуе рэжысёр уваход «дэлегацыі» Цара Салтана ў горад Ледзянец. — Спачатку — аб'ект улады, потым — суб'ект улады!

Пад дружны смех Цар Салтан у джынсах, спяшаючыся, адыходзіць за абазначаныя драўлянымі рэйкамі вароты, за ім накіроўваюцца стражнікі з дзідамі... А на галёрцы другі Цар Салтан — у спектаклі два саставы — уважліва сочыць за «двайніком» і падпявае...

Тры гадзіны дня. Карыстаючыся паўзай, гутарым з Ірынай Крыкуновай. Аказваецца, у спектаклі ўдзельнічае не толькі пяты курс, у ім занятыя студэнты ўсіх курсаў, акрамя першага.

— Але гэта менавіта дзяржэкзамен для пятага курса. Кожны год у нас такі выпускны спектакль. У гэтым годзе іх два, «Казка пра цара Салтана», якую стаўлю я, і «Іаланта», якую ставіць дацэнт нашай кафедры Ганна Маторная, галоўны рэжысёр Вялікага тэатра.

— А чаму менавіта гэтыя оперы?

— Кожны год збіраемся ўсім факультэтам і ў залежнасці ад кантынгенту студэнтаў, наяўнасці галасоў выбіраем спектаклі. У нас сёлета вялікі курс, васямнаццаць чалавек. Таму зразумела, што спектаклі павінны быць з большай колькасцю персанажаў. У «Казцы пра цара Салтана» задзейнічана вельмі шмат выканаўцаў, напрыклад ёсць магчымасць падключыць адразу тры сапрана. Два саставы — гэта ўжо шэсць спявачак. А ёсць яшчэ і тры карабельшчыкі, шэсць дзякаў... Оперная студыя Акадэміі музыкі заснаваная яшчэ ў 1939 годзе, каб рыхтаваць артыстаў оперы. Чацвёрты і пяты курсы працуюць тут з аркестрам. Чацвёртаму курсу дастаткова праспяваць на рэпетыцыі, каб атрымаць атэстацыю за год. А пятаму трэба ўдзельнічаць у спектаклі для гледача.

— Калі і дзе можна будзе пабачыць гатовую оперу, на рэпетыцыі якой мы прысутнічалі?

— Перш за ўсё на гэтай сцэне ў галоўным корпусе Акадэміі (вул. Інтэрнацыянальная, 30). Наш «Салтан» нараджаецца 29 сакавіка ў 15.00. Другі спектакль — 1 красавіка. З прыходам на нашу кафедру галоўнага рэжысёра сімфанічнага аркестра Аляксандра Міхайлавіча Анісімава мы атрымалі ўнікальную магчымасць супрацоўнічаць з гэтым выдатным майстрам і выступаць на сцэне вялікай залы філармоніі. Там былі паказаны нашы студэнцкія работы: «Вар'яцкі дзянёк», паводле оперы Моцарта «Вяселле Фігара», сцэны з оперы Пракоф'ева «Вайна і мір». А наш «Салтан» будзе прадстаўлены філарманічнай публіцы 30 мая. Спектаклі «Салтана» і ў Акадэміі, і ў філармоніі прысвечаныя двум юбілеям: Рымскага-Корсакава — 180 гадоў і Пушкіна — 225.

— Нават цяпер заўважаецца шмат цікавых дэталяў. Напрыклад, хто прыдумаў эпізод з лялькай вуду?

— Задума мая, а прынесла саму ляльку, гэткую пачварынку, Ксюша, выканаўца партыі Бабарыхі. Ксенія Малахвейчук, вядома, адна з лідараў спектакля. Лідары ў кожным спектаклі ёсць. У нас гэта таксама Васіль Ліпскі, які спявае партыю Гвідона; Антон Карчэўскі, Алёна Якавук, Іван Кручко, Арцём Грышкевіч. Гэта ўсё, як кажуць у оперы, людзі-«первачы». Праўда, Алёне яшчэ лепш спявалася б, каб яна спала па начах, а не займалася вырабам дэкарацый і касцюмаў...

— Дык, можа, варта далучаць да афармлення такіх спектакляў студэнтаў з іншых творчых навучальных устаноў?

— Думка правільная. Ведаеце, я далучала... Але часам студэнтам цікава зрабіць усё сваімі рукамі. Мне падабаецца, што ў іх ёсць такая сумесная праца, — яны за гэты час проста становяцца адной сям'ёй. Здараецца, прыходзіць курс — усе адасобленыя, у вочы адзін аднаму не глядзяць. А тут — усё робяць разам, прыдумваюць. Яны натхнёныя, ганарацца зробленым і гатовыя працаваць да знямогі. Калі мы летась ставілі оперу Пучыні «Багема», таксама ўсё рабілі самі: збівалі скрыні, ашкурвалі дрэва, то ў нас быў сучасны крафтавы стыль.

— Дазваляеце вучням самім нешта прыдумваць?

— Так. Яны натхняюцца, пачынаюць жыць на сцэне. У чым прафесіяналізм рэжысёра? Каб спектакль жыў без яго прысутнасці.

— А калі дзеліце ролі, бываюць крыўды?

— Бывае ўсялякае, але мая задача — паказаць усіх студэнтаў з самага выйгрышнага боку. Яны павінны атрымаць на дзяржэкзаменах добрыя адзнакі. Запрашаем усіх, хто жадае, на нашы выступленні ў Акадэмію музыкі, куды ўваход вольны. На такія прагляды да нас прыходзіць усё больш і больш гледачоў.

— Значыць, у хуткім часе мы ўбачым вашых выпускнікоў на вялікіх сцэнах?

— У нас з Аляксандрам Міхайлавічам даўно выспела ідэя стварэння маладзёжнага музычнага тэатра. Гэта дало б магчымасць працаваць нашым выпускнікам, бо Вялікі тэатр, зразумела, не гумавы, усіх таленавітых спевакоў акадэміі ўзяць не можа. Маладзёжны оперны тэатр — вельмі цікавы праект. Трупа можа кожныя два гады абнаўляцца і будзе ўвесь час існаваць за кошт прытоку з кансерваторыі. Цяпер спевакі размяркоўваюцца ў каледжы выкладчыкамі, у гарады, дзе няма ні оперных сцэн, ні аркестраў. А яны павінны спяваць на прафесійнай сцэне! Перш чым выкладаць, яны мусяць рэалізавацца як спевакі, інакш гэта будуць людзі, незадаволеныя жыццём. Так што маладзёжны музычны тэатр, хоць бы камерны, патрэбны, у яго была б свая публіка.

Ірына Генадзьеўна вярнулася працягваць рэпетыцыю. Дзесьці чакалі свайго часу, каб развінуцца, крылы Царэўны-Лебедзя. Распяваліся два Салтаны і два Гвідоны. Вавёрка паскладала арэшкі ў кошык, каб ізноў адправіць іх у палёт... А мы будзем чакаць з'яўлення новага цікавага спектакля і ззяння новых беларускіх зорак.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

З КУПАЛАМ У СЭРЦЫ

Музей, прысвечаны Песняру, сёлета адзначыць 80-годдзе

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшоў круглы стол, прымеркаваны да юбілею ўстановы. Работнікі культуры, вучоныя, прадстаўнікі творчых саюзаў і партнёрскіх арганізацый гаварылі пра мінулае Дома Купалы (менавіта гэту назву ў якасці брэндавай хочуць прасоўваць работнікі ўстановы) і перспектывы яго развіцця, традыцыі і сучасныя тэндэнцыі.

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна ГАЛІНСКАЯ заўважыла, што сёння развіццё музея звязана са станам музейнай навукі, узроўнем развіцця новых інфармацыйных тэхналогій, запатрабаваннямі наведвальнікаў. Рэалії сённяшняга дня патрабуюць распрацоўкі новых форм работы з аўдыторыяй. Сучасны музей ператвараецца ў комплексны культурна-адукацыйны цэнтр, які павінен забяспечыць задавальненне шырокага спектра патрэб грамадства. Выконваць такія задачы прасцей менавіта ва ўзаемадзеянні з іншымі ўстановамі.

Але, бясспрэчна, і галоўную місію музея: збіранне, вывучэнне, захаванне і папулярызацыю творчасці класіка беларускай літаратуры — ніхто не адмяняў. Сёння ў музеі захоўваецца самая вялікая ў краіне колькасць матэрыялаў, звязаных з жыццём і творчасцю Янкі Купалы. Прычым штогод яны папаўняюцца, у тым ліку дзякуючы супрацы з архівамі, калегамі з іншых музейных устаноў, калекцыянерамі.

Як паведаміла **загадчык аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы Марыя БАРТКОВА**, днямі ў Нацыянальным архіве Беларусі былі знойдзены новыя матэрыялы, якія раней не друкаваліся, звязаныя з жыццём Янкі Купалы і яго жонкі Уладзіславы Францаўны ў Казані, дзе яны знаходзіліся ў час Вялікай Айчыннай вайны. Таксама маецца інфармацыя, якая датычыцца іншых пісьменнікаў, што ў той час былі ў эвакуацыі. Новыя даныя могуць быць выкарыстаны пры стварэнні сумесных праектаў з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і музеем Янкі Купалы ў сяле Пячышчы ў Татарстане (гэта адзіная музейная ўстанова, прысвечаная Песняру, за межамі Беларусі). Дарэчы, з Пячышчамі Дом Купалы даўно супрацоўнічае, яго мастакі ў свой час нават дапамагалі з афармленнем экспазіцыі ў Татарстане. Сёлета беларускія музейшчыкі разам з калегамі з Пячышчаў запланавалі правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі. Наладжаны таксама сувязі з расійскімі музеямі, прысвечанымі Пушкіну і Ясеніну, налета запланавана паездка да калег у Калінінград.

Адна з традыцый, закладзеных яшчэ Янкам Купалам, — падтрымліваць розных таленавітых людзей, асабліва творчую моладзь, — сёння працягваецца ў музеі. Ён выступае пляцоўкай, дзе мастакі могуць прадставіць сваю творчасць. На юбілейны год запланаваны мастацкі праект, прысвечаны творчасці Янкі Раманоўскага «Янка Купала ў маім сэрцы». У назву пакладзены словы пляменніка Купалы, якога дзядзька, які адчуў талент маладога чалавека, выправіў у вялікае мастацтва. Пройдзе гэты праект у Бялынічах, якія сёлета атрымалі статус культурнай сталіцы, у музеі Бялыніцкага-Бірулі.

4 красавіка ў Купалавым доме распачнецца праект, прысвечаны Леаніду Левіну, а таксама 75-годдзю парку Янкі Купалы, дзе знаходзіцца музей. Леанід Левін — адзін з аўтараў помніка Песняру і самога парку. У экспазіцыі будуць прадстаўлены рэчы з сямейнага архіва, якія ніколі раней не выстаўляліся.

Як заўважыла Марыя Барткова, музей дапамагае ствараць сістэму культурных каардынат для наведвальнікаў. На працягу ўсяго года ён будзе знаёміць гасцей у тым ліку з народнымі традыцыямі. Не будзем забывацца, што на іх у сваёй творчасці абапіраўся Янка Купала. У музеі пройдуць майстар-класы па рамёствах.

На традыцыйнае свята паэзіі і песні і народных рамёстваў «З адной думкаю аб шчасці Беларусі» музейшчыкі запрашаюць у Вязынку, дзе нарадзіўся народны паэт.

А 29 чэрвеня раяць прыехаць у Купалаўскі мемарыяльны запаведнік у Ляўкі, дзе пройдзе свята паэзіі. Гэта традыцыя закладзена 80 гадоў таму першым дырэктарам музея, жонкай Купалы — Уладзіславай Луцэвіч.

Сёлета стагоддзе зборніка «Безназоўнае», чаму будзе прысвечаны адзін з праектаў. Музейшчыкі таксама выступаюць з ініцыятывай да беларускіх выдавецтваў аб падрыхтоўцы факсімільнага выдання.

Юбілей — выдатная магчымасць прыгадаць яркія моманты жыцця, а таксама сабраць сяброў і аднадумцаў, якія жывуць з Купалам у сэрцы. Дзень нараджэння ўстановы адзначаць у маі ў Палацы культуры ветэранаў.

Загадчык аддзела культурна-адукацыйнай работы Дзіяна КАВАЛЕВІЧ распавяла, чым парадуе музей у юбілейны год, які сапраўды будзе насычаны ідэямі, мерапрыемствамі і праектамі, што спрыяюць папулярызацыі творчасці Песняра. Яна звярнула ўвагу на характэрную для сучасных музеяў тэндэнцыю па стварэнні доўгатэрміновых праграм: «Сёння мы спрабуем стварыць цэласную сістэму, задача якой — паслядоўнае і мэтанакіраванае далучэнне наведвальнікаў да нашага музея». Адзін з такіх культурна-асветніцкіх праектаў — «Музыка ў музеі». Ён рэалізоўваецца сумесна са студэнтамі і выкладчыкамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Саюзам пісьменнікаў Беларусі. У Доме Янкі Купалы адбываюцца літаратурна-музычныя сустрэчы. Самай першай імпрэзай у рамках гэтага праекта стала сустрэча «Гаспадыня Купалавага дома», прысвечаная жонцы Янкі Купалы.

Культурна-адукацыйны праект «Скарбонка таленатаў» прапануўвае гасцям паглыбіцца ў творчы свет народнага паэта і адкрыць для сябе новыя магчымасці і здольнасці з дапамогай майстроў і таленавітых людзей. Падчас яго можна не толькі пачуць пра цікавыя факты, але і вучыцца нешта рабіць уласнымі рукамі. Адкрыце праект праграма «Гэй да сонца, гэй да зор», якая адбудзецца 12 красавіка. Яна прымеркавана да Дня касманаўтыкі. Падчас яе наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з гісторыяй верша Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык», даведацца, чаму ў музеі Янкі Купалы ёсць здымкі касманаўтаў, а таксама зрабіць самалёт ці ракету ў тэхніцы арыгамі.

Культурна-адукацыйны праект «Паэзія без межаў» рэалізоўваецца сумесна з выкладчыкамі і студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і накіраваны на моладзь з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Невыпадкова праект робіцца з КНР: менавіта ў Пекіне ў 1957 годзе адбылася першая міжнародная выстаўка, прысвечаная юбілею Янкі Купалы. Вершы Купалы, паэма «Над ракой Арэсай» перакладзены на кітайскую мову. У рамках гэтага праекта кітайскія і беларускія студэнты Акадэміі музыкі чытаюць вершы народнага паэта.

Дарэчы, Янка Купала стаяў каля вытокаў Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, створанага ў 1926 годзе, якое садзейнічала наладжванню кантактаў паміж беларусамі і жыхарамі іншых краін.

У юбілейны год распачаты Мінскі гарадскі конкурс відэаролікаў «Люблю музей» сярод вучняў першых — адзінаццатых класаў. Школьнікі могуць запісаць відэаролікі, у якіх паказаць сваю прычыну, чаму варта любіць музей, прысвечаны Купалу. Галоўная мэта конкурсу — патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны, прыцягненне ўвагі да аднаго з найстарэйшых музеяў краіны. Фінал конкурсу адбудзецца ў красавіку 2024 года.

Штогод, пачынаючы з 2009-га, у Купалавым доме праходзіць міжнародная акцыя «Ноч музеяў». Гэта выдатная магчымасць паказаць рэсурс установы, яе магчымасці, патэнцыял. Сёлета ў рамках акцыі запланаваны культурна-адукацыйны праект «Юбілейная ноч». Восем музейных прадметаў прадставяць восем дзесяцігоддзяў. Гэта будзе аснова для стварэння незвычайнага аповеду, квэсту ці гульні, звязаных з экспазіцыяй. У музеі пройдуць конкурсы, віктарыны, будуць створаны фотазоны.

Грамадска-культурная акцыя «Чытаем Купалу разам» праводзіцца ў музеі з 2012 года. Далучыцца да яе можна падчас экскурсій, вернісажаў, літаратурна-музычных вечарын. Распрацаваны макет паштоўкі з вершамі Янкі Купалы ў перакладзе на 85 моў свету. Удзельнікамі гэтага праекта ўжо былі прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса і Камісіі па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, актывісты беларускай дыяспары ў розных краінах свету, паэты, барды, акцёры вядучых тэатраў, спартсмены, студэнты, школьнікі. Сёлета такая акцыя будзе праведзена на рэспубліканскім культурна-патрыятычным мерапрыемстве «Ніхто не забыты, нішто не забыта» 9 Мая, на Дні беларускага пісьменства, на мерапрыемствах да Дня народнага адзінства і іншых.

Прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў нагадалі, што музей з'яўляецца філіялам кафедры гісторыка-культурнай спадчыны. Тут праходзяць практыку студэнты, летась на яго базе адбылося прысвячэнне ў першакурснікі. Супрацоўнікі музея прыходзілі на заняткі ва ўстанову. Супрацоўніцтва дазваляе адаптаваць навучанне пад патрэбы музея.

Адзін з надзейных партнёраў музея — Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук. **Валянціна МАРОЗ**, якая яго прадставіла падчас круглага стала, нагадала, што на гэты год прыпадае таксама 100-годдзе з надання Купалу ганаровага звання — «Народны паэт Беларусі». Яна прапанавала ўдзяліць гэтай даце асаблівую ўвагу: «Пра сталасць і вартасць народа, нацыі сведчыць не тое, якіх талентаў, геніяў нарадзіў гэты народ, а тое, як ён ставіцца да гэтых геніяў, як абыходзіцца з імі, што робіць для ўшанавання памяці».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ,
фота аўтара.

Гісторыя Савецкага раёна працягваецца...

У гімназіі з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска гасцінна адчыніў свае дзверы пасля рэканструкцыі музей Савецкага раёна г. Мінска «Гісторыя працягваецца...»

Яму больш за 20 гадоў. Рэканструкцыя вялася з 31 студзеня 2023 года да 17 сакавіка 2024 года. Дарэчы, шматкроп'е ў назве з'явілася нездарма.

— Адкрыццё — гэта толькі першая прыступка ў развіцці нашага музея. Ён будзе папаўняцца, таму кропку ставіць яшчэ не час, — патлумачыла **дырэктар навучальнай установы Ірына ПАСЮКЕВІЧ.**

Паводле яе слоў, акрамя цікавых гістарычных фактаў распрацоўшчыкі музея, настаўнікі і вучні таксама шукалі звесткі аб прадпрыемствах і ўстановах Савецкага раёна.

— Дзякуючы іх дзейнасці, сёння тут смела можна праводзіць прафарыентацыйную работу. Менавіта такая мэта была ў музея — стварыць прыдатную атмасферу для нашых вучняў, а таксама паказаць гасцям, што Савецкі раён — квітнеючы раён, — адзначыла Ірына Пасюкевіч.

Ва ўнікальнай экспазіцыі арганічна сышлося мінулае і сучаснасць. Усе стэнды падзелены тэматычна, што дапамагае структураваць інфармацыю.

Вялікі акцэнт у музейнай экспазіцыі зроблены на вядомых асобах, звязаных з Савецкім раёнам. Так, тут ёсць сімвалічная дошка гонару, якую ўпрыгожваюць партрэты выдатных беларусаў. Напрыклад, сярод іх — беларускі пісьменнік Мікалай Чаргінец, спевакі Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, а таксама савецкі і беларускі кампазітар Васіль Раінчык.

Па словах **кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна Сяргея ХІЛЬМАНА**, Савецкі раён — гэта залатая сярэдзінка нашай сталіцы. Менавіта тут сабраны як найманаўтэйшыя прадпрыемствы эканамічнага профілю, так і культурныя, а таксама навуковыя ўстановы.

— У гэтай экспазіцыі фактычна паказана, як дабіваліся жыхары нашага раёна ўсіх гэтых поспехаў. Прыемна бачыць, што на адкрыццё прыйшлі кіраўнікі ўсіх прадпрыемстваў раёна, — заявіў ён.

Сяргей Хільман таксама адзначыў і важны ідэалагічны складнік музейнай экспазіцыі:

— На такіх музеях мы выхоўваем грамадзянскасць і патрыятызм у моладзі. Таксама і госці гімназіі № 23 пасля прагляду экспазіцыі будуць адразу бачыць, якіх поспехаў дасягнула наша сталіца, наш раён, і разумець, што тут жыве працавіты народ, які на карысць будучых пакаленняў прымнажае тое, што ёсць, і робіць квітнеючай нашу сталіцу і нашу краіну.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Дзеля памяці

ЛІ-2 ВЯРНУЎСЯ З БАЯВОГА ЗАДАННЯ

Раскрыта яшчэ адна невядомая старонка гераічнага подзвігу савецкіх лётчыкаў

Гісторыя інтрыгоўная і неверагодная. Экіпаж ваеннага самалёта Лі-2 лічыўся без вестак зніклым з кастрычніка 1943 года. Такіх, як ён, тысячы — разбіліся, згарэлі, затанулі. Але ў Лі-2 атрымалася вярнуцца з небыцця пасля 80 гадоў сваёй адсутнасці. Вядомы імёны ўсіх членаў экіпажа, ёсць нават іх фота. Сярод лётчыкаў — і наш зямляк з Бабруйскага раёна Іларыён Парахневіч. Па шчаслівым збегу абставін менавіта ў Бабруйску газета з артыкулам пошукавіка з Масквы Алены Шутавай пра гераічны экіпаж трапіла на вочы радні гэтага лётчыка. А хутка высветлілася, што ў Асіповічах дагэтуль свайго бацьку чакаюць дзве яго дачкі — Ганна і Мая. У 1941-м, калі 28-гадовы Іларыён Фядосавіч пайшоў на фронт, старэйшай Маі было пяць гадкоў, Ганне — усяго тры.

Дачка лётчыка Іларыёна Парахневіча цяпер дакладна ведае, дзе пахаваны яе бацька.

ДЗЁННІК У ШКОЛЬНЫМ МУЗЕІ

Нічога выпадковага ў нашым жыцці не бывае. І гэта гісторыя таму пацвярджэнне. У Магілёве **начальнік штаба Магілёўскага гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» Святлана БАРЫСЕНКА** правярае інфармацыю па месцах пахавання байцоў спецатрада асаблівага прызначэння «Слаўны» і выходзіць на след ваенна-транспартнага самалёта Лі-2. У гэтым ёй дапамагае дзённік спецатрада, які захоўваецца ў музеі магілёўскай школы № 22. У канцы 70-х гадоў мінулага стагоддзя яго арыгінал перадаў школе начальнік штаба спецатрада Міхаіл Абаротаў. Гэтаму папярэднічала яго выпадковая сустрэча з кіраўніком музея Аленай Кірэевай, якая актыўна займалася пошукавай дзейнасцю. Яны пасябравалі. Сам Міхаіл Абаротаў і байцы спецатрада неаднаразова наведвалі школу і музей. Потым арыгінал быў перададзены ў музей КДБ, а ў школе засталася копія, над якой і працавала Святлана Барысенка. Апошнім часам клуб актыўна займаецца пошукам самалётаў, якія прапалі без вестак, і ўстанаўлівае імёны лётчыкаў. Таму напрактыкаванае вока адразу ж выхапіла з запісаў інфармацыю пра савецкі самалёт «Дуглас», які быў збіты якраз над тым месцам, дзе размяшчаўся лагер спецатрада.

— «Дуглас» — гэта пратып савецкага ваенна-транспартнага самалёта Лі-2, — удакладняе Святлана. — Пра факт, што над Бялыніцкім раёнам быў збіты самалёт, мы нічога не ведалі і вельмі ўзрадаваліся шчаслівай знаходцы. У дзённіку былі прозвішчы ўсіх лётчыкаў, якія загінулі, а таксама сведчанне, што байцы спецатрада пахавалі экіпаж за кіламетр ад вёскі Белы Лог.

Пакуль Святлана вяла сваё расследаванне, у Маскве гэту тэму ўзняла ветэран атрада асаблівага прызначэння «Русь» Алена Шутава. Яна знаходзіць інфармацыю пра самалёт у кнізе лётчыка Мікалая Гарнастаева «Мы ваявалі на Лі-2» і размяшчае ўрывак з яе ў газеце з заклікам да сваякоў лётчыкаў адгукнуцца.

«ПОМНЮ ТАТУ З РАСКАЗАЎ МАЦІ»

Пра тое, што ў газеце выйшла публікацыя пра яе бацьку, Ала Іларыёнаўна Шуба даведалася ад бабруйскай радні. Яна пазваніла ў рэдакцыю і пакінула там свой нумар тэлефона. Хутка з ёй звязалася аўтар публікацыі Алена Шутава. Факт, што Іларыён Парахневіч загінуў у Бялыніцкім раёне, пацвердзіўся. Шутава паведаміла дачцэ, дзе пахаваны яе бацька, а потым прыслала кнігу Мікалая Гарнастаева «Мы ваявалі на Лі-2», дзе на 142-й старонцы ёсць словы пра экіпаж. Разам з кнігай Ала Іларыёнаўна атрымала газету з публікацыяй, выпіскі з узнагародных лістоў бацькі і фота экіпажа.

На даваенным фота Марыя і Іларыён Парахневічы (першы рад) і брат Марыі — Васіль Піменаў.

Гэта кніга сёння ў яе на самым бачным месцы ў шафе, побач з даваеннымі фота дарагіх яе сэрцу людзей. На адным з іх зусім маладыя бацькі разам з братам маці — Васілём Піменавым. Ён таксама ваяваў і загінуў. Фота зроблена ў жніўні 1940 года на авіяцыйным свяце ў Мінску. На адваротным боку напісана «Варыён і Вася». Ала Іларыёнаўна ўдакладняе, што дзядзька Вася чамусьці называў тату Варыёнам.

— Помню тату толькі з расповедаў маці, — вяртаецца яна ў мінулае. — Да вайны мы жылі ў горадзе Пачынак Смаленскай вобласці, там знаходзіўся авіяцыйны полк. І маці казала, што, як толькі аб'явілі вайну, бацька падхапіўся, хуценька апрануўся і пабег на аэрадром. Наогул, усё ў гарадку прыйшло ў рух. Мужчыны беглі да сваіх самалётаў, а жонкі з дзецьмі — за імі следам і ўголас плакалі. Маці засталася адна з намі дзвюма маленькімі на руках. Эшалон, на якім мы спачатку адправіліся ў эвакуацыю, быў разбіты, і маці вырашыла ехаць да дзеда Фядоса — бацькі таты — у вёску Варатынь, што ў Бабруйскім раёне. Немцы зрабілі ў доме дзеда штаб, а нас адправілі ў хлеў. Але неяк яны даведаліся, што маці — жонка лётчыка. Адзін з іх прыбег да нас і стаў крычаць нешта незразумелае, паказваючы на неба і пагрозліва паўтараючы: бум-бум. Маці схапілі і моцна білі. Выратаваў яе наш сусед. Ён хоць і быў паліцаем, але пашкадаваў жанчыну. Сказаў, што плёткі пра лётчыка — гэта хлусня. Маці адпусцілі, але з таго часу мы стараліся трымацца ад немцаў далей.

Аднойчы яны знайшлі ў кустах сваіх забітых салдат і сталі помсціць. Усіх жыхароў вёскі, у тым ліку і дзяцей, паставілі ўздоўж вуліцы і пачалі паліць дамы праз адзін. Усе вельмі плакалі. Але прыехаў нейкі нямецкі чын, і быў дадзены адбой. Людзей не кранулі, але дамы працягвалі паліць.

Ала Іларыёнаўна з цеплынёй у голасе ўспамінае свайго дзеда Фядоса. Ён быў неверагодна мужны чалавек. Бабуля памерла яшчэ да вайны падчас родаў. На выхаванні дзеда заставалася нованароджаная дзяўчынка. Потым яна стала настаўніцай, прыехала працаваць у вёску да свайго бацькі і даглядала яго да смерці. Фядос Іванавіч так больш і не ажаніўся. З дзевяці яго дзяцей двое сыноў загінулі яшчэ да пачатку Вялікай Айчыннай: адзін — ад рук кулакоў, другі — на фінскай вайне, яшчэ дваіх сыноў і дачку забрала Вялікая Айчынная вайна. Забойства цёткі адбылося на вачах маленькай Алы.

— Немцы схапілі цётку Насцю і яе мужа-партызана, прывезлі ў вёску, паклалі ў канаву з вадой і моцна білі, — успамінае сураз-моўніца той жахлівы выпадак. — Потым іх нерухомыя целы пагрузілі на машыну і вывезлі ў невядомым напрамку. У дзеда застаўся іх маленькі сын Мікалай, якому было на той момант гадкі тры-чатыры.

ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ

Пра тое, што Іларыён Парахневіч прапаў без вестак, сям'я даведалася ў 1943 годзе. Дачка лётчыка ўспамінае, што ўжо пасля вайны прыйшоў ліст, як казалі дарослыя, ад партызан, дзе паведамлялася, што самалёт, на якім ваяваў Іларыён Парахневіч, разбіўся ў Бялыніцкім раёне. І была прыпіска, што пры адным з лётчыкаў знаходзіўся фотаздымак маленькай дзяўчынкі.

— Маці ўспомніла, што бацька, калі сыходзіў на фронт, прыхапіў фота Маі, маёй старэйшай сястры, — расказвае Ала Іларыёнаўна. — Але матуля чамусьці не паверыла, што ў лісце размова ішла менавіта пра яе мужа. Тым больш што малодшы брат таты — дзядзька Валодзя, які на той час быў супрацоўнікам КДБ, пацвердзіць інфармацыю па сваіх крыніцах не змог.

Сёння дачка лётчыка ведае дакладна, што яе бацька быў герой. З узнагародных лістоў за 27.07.43 года вядома, што паветраны стралок 102-га Чырванасцяжнага авіяпалка далёкага дзеяння Іларыён Парахневіч здзейсніў болей чым 120 баявых вылетаў. Знішчаў вялікія групоўкі нямецкіх войскаў, іх матчасць і аэрадромы на тэрыторыі Краснадарскага краю і Крыма. Біў ворага падчас начных вылетаў на арлоўскім і курскім напрамках. Быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За адвагу».

— Я вельмі ганаруся бацькам і рада, што цяпер дакладна ведаю ўвесь яго баявы шлях, — кажа Ала Іларыёнаўна. — Сёлета збіраемся з дачкой і зяцем, якія прыедуць з Масквы, пабываць на магіле ў вёсцы Глыбокі Брод. Дачка сказала, што яны ўжо ведаюць, як туды ехаць, спланавалі маршрут. Магчыма, і ўнук Ілья далучыцца, ён вельмі цікавіцца лёсам прадзеда. Шкада, што не паспеў пабываць на магіле брата дзядзька Валодзя, які доўгі час шукаў яго. Дзесяць гадоў таму ён пайшоў з жыцця. А памяць таты мы ўшаноўвалі на воінскім пахаванні ў аграгарадку Вяззе, што непадалёк ад Асіповіч. Там ёсць помнік чырвонаармейцам, якія загінулі падчас вайны. Туды мы прыязджалі штогод і прывозілі кветкі. Нарэшце стала вядома, дзе пахаваны мой бацька.

ИМЕННОЙ СПИСОК

У баявым данясенні, дзе пайменна пералічваецца экіпаж Лі-2, значыцца прозвішча Пятра Баталікіна.

ПАМЫЛКІ ТРЭБА ВЫПРАЎЛЯЦЬ

Непрыемная дэталь у гэтай гісторыі — прозвішча Іларыёна Парахневіча на абеліску ў вёсцы Глыбокі Брод напісана з памылкай. Гэта, на жаль, не адзіны падобны факт. Нездарма клуб «Віккру» сумесна з Магілёўскім абласным цэнтрам творчасці запусціліся на тэрыторыі вобласці праект «Навучыся помніць», які разлічаны на школьнікаў. Іх задача — вывучыць імёны на воінскіх пахаваннях, якія ёсць у іх мясцовасці, і параўнаць з электроннымі базамі. У гэтым дапамагаюць настаўнікі. Як сведчаць пошукавікі, шмат такіх памылак здарылася ў 50-я гады, калі адбывалася ўзбуйненне воінскіх пахаванняў і ліквідацыя адзіночных магіл. Прычым прозвішчы пераносіліся, а вось астанкі — не заўсёды. Не выключана, што ў выпадку з лётчыкамі, дзе значыцца Іларыён Парахневіч, было менавіта так. Магілёўскія пошукавікі спрабуюць давесці гэтую гісторыю да канца і праверыць першапачатковую магілу каля вёскі Белы Лог.

— А калі КДБ дапаможа з транспартам, то і разведку правядзём на тым месцы, дзе скончыўся баявы шлях Лі-2, — кажа Святлана Барысенка. — Улічваючы, што там балота, зрабіць гэта самастойна, без спецтэхнікі, не зможам.

А яшчэ падчас работы над дзённікам спецатрада атрымалася выправіць некалькі памылак. У Абаротава размова ідзе пра шасцярых членаў экіпажа, але прозвішча Цагенько, на думку Святланы, трапіла туды выпадкова.

— Камандзірам экіпажа, які разбіўся ў Бялыніцкім раёне, быў Аляксандр Барысаў, а Цагенько, які выпадкова трапіў у спіс, таксама быў камандзірам, але іншага экіпажа, — кажа яна. — Цагенько згарэў у самалёце некалькі месяцаў раней — у ноч з 10 на 11 жніўня 1943 года — пры выкананні баявога задання ў раёне станцыі Сінявіна Ленінградскай вобласці. Затое ў данясенні аб стратах ёсць запіс, што бортмеханікам на Лі-2 быў Баталікін. І гэтаму дакументу нельга не давяраць. Не Цагенько, а Баталікін быў у самалёце. Чаму адбылася блытаніна ў дзённікавых запісах, сказаць цяжка. Хутчэй за ўсё ў самалёце, які разбіўся, знаходзіліся дакументы Цагенько. І яго імя выпадкова трапіла на абеліск. Гэта памылка, і яе таксама трэба будзе выпраўляць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара і з архіваў гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру».

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9. УНП 100219778
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (www.ipmtorgi.by)

Предмет электронных торгов: транспортные средства, бывшие в употреблении

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС, бел. руб.
1	**Легковой внедорожник универсал УАЗ 3163-344 Патриот,** 3939ЕВ-2, 2011 г. в., инв. № 100000010607. Месторасположение: Витебская область, д. Селище	**14 880,00**
2	**Легковой внедорожник универсал УАЗ 3163-349-03,** 8905КТ-1, 2014 г. в., инв. № 100000047823. Месторасположение: Брестская область, г. Кобрин, Дзержинского, 135	**12 000,00**
3	**Трактор МТЗ-82.1**, рег. знак МВ 4953, 1995 г. в., инв. № 100000041962. Месторасположение: Минская область, Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 165	**7 200,00**
4	**Автобус-вагон GAZ 32213,** рег. знак АІ5532-3, 2013 г. в., инв. № 100000041627. Месторасположение: Гомельская область, Мозырский район, Козенский сельсовет, 1	**2 040,00**
5	**Автомобиль грузовой бортовой тентованный МАЗ 631208 020-010,** рег. знак АК3351-6, 2005 г. в., инв. № 100000038094. Месторасположение: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Лапичский с/с, аг. Лапичи	**16 920,00**

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены

